№ 16 (614) 22 красавіка 2009 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

**Гора, гора — з'елі Ягора**

Старонка 2




**Прыкметы другой хвалі крызісу**

Старонка 4

**Анатоль Ляўковіч: «Хай Гайдукевіч да мяне дарасце!»**

Старонка 7

## У НУМАРЫ

**Супольная заява Казуліна, Пазняка, Сурвіллы, Шушкевіча**

Не — запрашэнню Лукашэнкі. **Старонка 3.**

**Стражаў пракалоўся**

Кітай падазрае Мінск у «падвойнай гульні» і пагражае ахаладжэннем адносінаў. Прычына — выстава пра Тыбет і кніга намесніка дырэктара Інстытуту Канфуцыя пры БДУ. **Старонка 6.**

**Верхні горад: праект рэгенерацыі**

Архітэктары УП «Мінскпраект» сканчаюць працу над праектам адбудовы Верхняга гораду. **Старонка 6.**

**Падлеткавая жорсткасць і дарослая мяккасць**

У Краснаполлі, што на Магілёўшчыне, дачка міліцыянта з сяброўкай збілі малодшую на год школьніцу. **Старонка 11.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.




## Палітбюро-2009
# Русалка на аблоках

Выходзіць на трыбуну маладая прывабная жанчына, добра апранутая, з ласкавай усмешкай, і пачынае свой выступ шматзначнай фразай: «Я плавала ў басейне, і мне прыйшла ў галаву думка…» **Аляксандр Фядута** піша пра Наталлю Пяткевіч — у цыкле «Палітбюро–2009».

Яна пачала працаваць у Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі ледзь не ў жніўні 1994 г. На працу зусім яшчэ юную Наталлю Пяткевіч браў Аляксандр Марыскін. Гэта было так даўно, што ніхто, акрамя супрацоўнікаў Канстытуцыйнага суду, дзе цяпер сканчае сваю юрыдычную кар'еру на пасадзе намесніка старшыні спадар Аляксандр, гэтых часоў не памятае. А сам Марыскін наўрад ці каму распавядае, што прасіў яго працаўладкаваць спадарыню Пяткевіч не хто іншы, як кандыдат №1 на пасаду кіраўніка вышэйшага органу канстытуцыйнага нагляду Валеры Ціхіня. Менавіта ён адрэкамендаваў сваю таленавітую студэнтку начальніку галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення Адміністрацыі.

Марыскін прыслухаўся. З Ціхінем у тыя часы лепш было не спрачацца: перспектыўны быў. А значыць, перспектыўнай была і ягоная юная пратэжэ.

Так яна апынулася ў Адміністрацыі. На самай нізкай чыноўніцкай пасадзе: вядучага спецыяліста. Але ў той момант ні на што іншае разлічваць і не магла. Што ў яе было за плячыма? Юрфак? Вельмі добра. Але Мінск — такі горад: куды ні плюнь, у юрыста трапіш. І ўпраўленне, у якім пачала Наталля Пяткевіч сваю кар'еру, цалкам з юрыстаў складалася.

**Працяг на старонцы 8.**

# Лукашэнку паслалі памаліцца

**Аляксандру Лукашэнку перадалі запрашэнне на саміт «Усходняга партнёрства» ў Прагу, аднак канчатковае рашэнне, ці ён паедзе, яшчэ не прынятае. Затое стала вядома пра візіт беларускага кіраўніка ў Рым і Ватыкан 27 красавіка.**

Міністр замежных справаў Чэхіі Карэл Шварцэнберг 17 красавіка падчас свайго прыезду ў Мінск перадаў Аляксандру Лукашэнку запрашэнне на саміт «Усходняга партнёрства» ў Прагу.

Зрэшты, гэта не стала такой ужо нечаканасцю. Рашэнне запрасіць беларускага лідэра было прынятае яшчэ напрыканцы сакавіка падчас сустрэчы міністраў замежных справаў Еўрасаюзу. Разам з тым, было вырашана заключыць з беларускім бокам «джэнтэльменскае пагадненне», што 7 траўня ў Чэхію прыедзе не Лукашэнка, а міністр Мартынаў ці нехта яшчэ з чыноўнікаў.

Такая далікатная місія, як данесці да Лукашэнкі рашэнне Еўрасаюзу, выпала князю Карэлу Шварцэнбергу, які завяршае сваю працу на чале чэшскага МЗС. І, мяркуючы па тым, што падчас візіту чэха ў Мінск не было абвешчана, хто прадставіць Беларусь на саміце, Шварцэнбергу ўдалося, калі не выканаць канчаткова задачу, то дакладна не праваліць.

**Працяг на старонцы 3.**



**Маршруты па Беларусі: край белай птушкі**

Ёсць у нашай краіне куток, нібы наўмысна пакінуты людзьмі птушкам, — Асвейшчына, з другім па памеры возерам Беларусі. Піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 12.**

# Пуцін: «Крэдытная нагрузка на Беларусь становіцца пагрозлівай»

«Але мы працягвалі і будзем працягваць супрацоўніцтва», — заявіў прэм’ер-міністр Расіі падчас наведвання Цвяры. Гэтыя словы прагучалі, нібы апошняе кітайскае папярэджанне. Не столькі пра стан беларускіх фінансаў, колькі намёк, што Расія гатовая спыніць фінансаванне.

Расія прадаставіла Беларусі крэдыты больш чым на 3 млрд даляраў. Урад Расіі разглядае магчымасць выдзялення Беларусі дадатковых 500 млн даляраў для падтрымання бюджэту.

У пачатку красавіка 2009 г. ўрад Беларусі заявіў, што перамовы з Расіяй нарэшце дадатковага крэдыту 100 млрд расійскіх рублёў працягваюцца.




# Гора, гора — з’елі Ягора

Заява Хрусталёва пра сыход з АНТ была падпісаная імгненна.

Першы намеснік старшыні АНТ і вядучы ток-шоу «Выбар» Ягор Хрусталёў пакінуў АНТ. Раніцою 20 красавіка Хрусталёў напісаў заяву пра сыход, патлумачыўшы яго тым, што атрымаў больш выгадную прапанову за межамі краіны.

Папера была падпісаная імгненна, і Хрусталёў больш не з’яўляецца супрацоўнікам АНТ. Гэтыя дні тэлефон тэлевядучага не адказваў.

Ягор Хрусталёў быў адным з творцаў сучаснай сістэмы лукашэнкаўскага ТВ. На АНТ працаваў з моманту заснавання каналу — з 2002 году.

**МБ**

# Трэнера каманды, якая перамагла Лукашэнкаву, звольнілі на наступны дзень

А калі інфармацыя пайшла ў інтэрнэт, аднавілі.

20 красавіка жлобінскі хакейны клуб «Металург» датэрмінова спыніў кантракт з галоўным трэнерам каманды Яўгенам Лебедзевым. Звальненне было нечаканым, бо каманда заваявала бронзу чэмпіянату Беларусі. «Металург» з’яўляецца адной з найбагацейшых беларускіх камандаў.

Дадатковым чыннікам у адстаўцы спецыяліста магла стаць перамога хакеістаў Гомельскай вобласці, якой кіраваў Лебедзеў, над камандай А.Лукашэнкі ў фінальнай сустрэчы аматарскага турніру. Дагэтуль «аматарскую каманду» Лукашэнкі ў Беларусі не перамагаў ніхто, як ніхто з лыжных чэмпіёнаў не здольны быў абагнаць афіцыйнага кіраўніка на лыжнай дыстанцыі.

49-гадовы Лебедзеў кіраваў «Металургам» ад часу стварэння клубу.

Сам Лебедзеў не звязваў свайго звальнення з перамогай над камандай Лукашэнкі.

Па абедзе на сайце «Металургу» з’явілася абвяржэнне інфармацыі аб звальненні. Паводле словаў дырэктара клубу А.Багарада, дакументаў аб адхіленні трэнера аформлена не было, хаця кіраўніцтва «турбуе непаважлівы характар і няўменне выслухваць крытычныя заўвагі». «Кантракт з Лебедзевым дзейнічае да 30 чэрвеня 2010 г. Яму прапанавана выконваць абавязкі, нягледзячы на ўсю шуміху, якую ён падняў у СМІ», — гаворыцца ў заяве.

**ЗП**

КАМЕНТАР

# Майстэрства шаблону

«Каб знайсці дзесяць адрозненняў паміж традыцыйнымі Дзядамі, Днём Волі і Чарнобыльскім шляхам, трэба добра напружыцца. Адны і тыя ж прамовы, выступоўцы, маршрут — у бок Бангалору», — піша аглядальніца газеты «Новы час» Вольга Хвоін у сваім артыкуле «Майстэрства шаблону».

Дазвольце! На Дзяды ні разу за 20 гадоў ніхто не хадзіў на Бангалор. У гэты дзень людзі ходзяць у Курапаты ў знак памяці пра ахвяры акупацый.

На Дзень Волі ў 2009-м людзі не хадзілі на Бангалор. У 2008-м людзі спрабавалі прарвацца ў цэнтр, і кадр з акрываўленым фотарэпарцёрам з Мінску абышоў свет цэлы. У 2007-м людзі збіраліся ў цэнтры і рознымі калонамі збіраліся ад цэнтру да Акадэміі. У 2006-м Дзень Волі па-пад ачэпленым Плянцам Каліноўскага, калі тысяча дэманстрантаў працягвала сядзець у турмах, стаў фінальным акордам Плошчы...

Словы журналісткі не сыходзяцца з рэальнасцю аніяк.

Значэнне несавецкіх палітычных традыцыяў для фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці, альтэрнатыўнага палітыкуму вялікае. Нават у часы максімальнай палітычнай апатыі дэманстрацыі ў цэнтры сталіцы, шматлюдныя ці малалюдныя, якія б маршруты ні абіралі іх арганізатары, застаюцца ў ліку самых яркіх палітычных падзеяў, трапляюць у цэнтр увагі СМІ і выклікаюць найбольшае раздражненне лукашэнкаўцаў. Агіду выклікаюць не тыя шэсці, куды людзі ходзяць па ўласнай волі, а саветызуючыя абрады, да якіх ідэолагі змушаюць насельніцтва.

Журналістка Хвоін, захапіўшыся рытуальнымі лямантацыямі, проста заблукала ў трох хвоях.

**Барыс Тумар**

«Чарнобыльскі шлях» сёлета дазволены выканкамам. Ён пачнецца ў нядзелю, 26 красавіка, а 12.00 ад Акадэміі навук і пройдзе вуліцамі Хмяльніцкага і Сурганава да Чарнобыльскай капліцы на вуліцы Карастаянавай.

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

**Гродна: сустрэча памяці Аляксея Карпюка**

23 красавіка адбудзецца прэзентацыя біяграфічнай кнігі пісьменніка «Развітанне з ілюзіямі» і відэаінтэрв’ю яго жонкі Іны Карпюк. Пачатак у 19.00 па адрасе: Гродна, вул. Будзённага, 48а–44. Уваход вольны.

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

## Дзякуй

**Валянціне Ш., Л.Г., З.А., А.Л., Сямёну Л., Вользе Ш., Ніне Ш., Ігару Б., Дз. Я., В.Б., П.Ч., Р.П., Д.К., В.Л., Алегу М., Г.С., Аляксандру С., Івану С., А.Дз., Валянціне Дз., В.Л., Генадзю Ш., Георгію П., С.Ц., І.Б., І.С., Таццяне В., Алегу Т., Тамары Л., Галіне Ж.** з Мінску.

**Мікалаю В.** з Белаазёрску

**Ірыне Ц.** з Жыткавічаў

**Аляксандру Д.** з Карэліцкага раёну.

**Антону Б.** з Верхнядзьвінску

**С.К.** з Пінску

**Віктару К.** з Рэчыцы

**Яўгенію К.** з Віцебску.

# Лукашэнку паслалі памаліцца

Працяг са старонкі 1.

Лукашэнка ляціць у Ватыкан. Пра гэта першым паведаміў міністр замежных справаў Італіі Франка Фраціні.

Як паведамляе Reuters Italia, беларускі лідэр прыбудзе ў Рым для сустрэчы з кіраўніком Каталіцкай Царквы, а таксама для перамоваў з міністрам замежных справаў Італіі. Ці ўдасца лідэру Беларусі сустрэцца з прэм'ер-міністрам Сільвіё Берлусконі, яшчэ невядома. На сённяшні момант такога пункту ў праграме не значыцца, аднак магчымыя іншыя варыянты. Слаба верыцца, што Берлусконі ўпусціць такую магчымасць.

Фраціні таксама выказаўся за ўдзел Лукашэнкі на сустрэчы «Усходняга партнёрства» ў Празе. «Кожная краіна павінна сама вырашаць узровень свайго ўдзелу ў саміце. Я не думаю, што гэта павінен вырашаць Еўрасаюз», — зазначыў Фраціні.

Гэта будзе першая паездка Лукашэнкі ў краіну Еўрасаюзу пасля кастрычніцкага зняцця візавых санкцый. Апошні ж афіцыйны візіт беларускага кіраўніка ў межы Еўрасаюзу адбываўся ў далёкім ужо 1995 годзе ў Францыю. Пасля таго ён толькі некалькі разоў знаходзіўся з прыватнымі візітамі на гарналыжных курортах Аўстрыі і Славеніі.

Нагадаем, што на мінулым тыдні Лукашэнка сустракаўся ў Маскве з Патрыярхам Маскоўскім Кірылам, а ў аўторак у Мінску — з архібіскупам Мінска-Магілёўскім Тадэвушам Кандрусевічам. Менавіта на гэтых сустрэчах і маглі абмяркоўвацца дэталі візіту Лукашэнкі ў Ватыкан.

**Зміцер Панкавец**

**Вацлаў Клаўс: Я не падам рукі Лукашэнку**

Пакуль міністр Шварцэнберг перадаваў Аляксандру Лукашэнку запрашэнне на саміт «Усходняга партнёрства» ў Прагу, з заявай зусім іншай танальнасці выступіў прэзідэнт Чэхіі Вацлаў Клаўс. Кіраўнік Чэхіі заявіў, што не падасць пры сустрэчы рукі Лукашэнку, а таксама не збіраецца яго прымаць у Пражскім градзе. Паводле прэсавага сакратара Радзіма Охвата, Вацлава Клаўса здзіўляе двайная мараль, якой кіруюцца тыя людзі, што запрашаюць Лукашэнку на саміт.

**Супольная заява Казуліна, Пазняка, Сурвіллы, Шушкевіча: Не — запрашэнню Лукашэнкі**

Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла, лідэр КХП–БНФ Зянон Пазняк, старшыня БСДГ Станіслаў Шушкевіч і кандыдат у прэзідэнты Беларусі на выбарах 2006 г. Аляксандар Казулін выступілі з супольным зваротам да Еўрасаюзу і еўрапейскіх палітыкаў.

Запрашэнне А. Лукашэнкі на саміт у Прагу аўтары звароту называюць «знакавым дзеяннем, якое, фактычна, легітымізуе дыктатуру, скасуе незаконнасць яе ўлады і прынятых антыпраўных рашэнняў. Вынікам запрашэння А. Лукашэнкі ў Прагу стане ўзмацненне рэпрэсіяў і этнацыду беларусаў, ціску на народ, пераследу па палітычных прычынах за іншадумства».

«У нас, падпісантаў гэтага звароту, розныя партыйныя пазіцыі і розныя погляды на палітыку, але пагроза незалежнасці нашай краіны і нашай грамадзянскай супольнасці, якая ўзнікае ў сувязі з аднабокімі дзеяннямі ў дачыненні да рэжыму на Беларусі, змушаюць нас гаварыць цяпер разам і адным голасам: Лукашэнка не павінен быць запрошаны ў Прагу», — гаворыцца ў заяве.

# Павел Севярынец: Гэта поўны сюррэалізм

**15 красавіка вечарам кіраўніцтва Беларускай хрысціянскай дэмакратыі атрымала адказ з Міністэрства юстыцыі, што іхняя партыя зарэгістраваная не будзе. Афіцыйная прычына — неадпаведнасць пададзеных дакументаў вынікам апытання, што праводзіў Мін'юст.**

«Нехта з супрацоўнікаў Міністэрства тэлефанаваў заснавальнікам БХД і задаваў блізу 10-15 пытанняў адносна правядзення з'езду. Вось пытаюцца: колькі было чалавек на пасяджэнні ў вашым раёне? Кажаце, дваццаць? Але ж іх было трыццаць. А колькі чалавек вылучалі на з'езд? Чатыры? А па дакументах пяць. Вось на такіх рэчах і была абгрунтаваная адмова», — кажа сустаршыня БХД Павел Севярынец.

Паводле палітыка, за час, калі дакументы былі пададзеныя ў Мін'юст, міліцыянты, кадэбісты, супрацоўнікі ідэалагічных аддзелаў райвыканкамаў паставілі амаль 30 сябрам БХД умову: ці ўдзел у партыі, ці праца. Але ніхто не адмовіўся ад сваіх перакананняў.

«Нам больш важнае прызнанне людзьмі, а не Мін'юстам», — кажа іншы старшыня хрысціянскіх дэмакратаў А.Шэін. «Мы не баімся 193-га артыкулу крымінальнага кодэксу («удзел у незарэгістраванай арганізацыі» — «НН»). Будзем працаваць як раней», — працягвае П.Севярынец.

Як у пацверджанне прыводзяць прыклад: БХД запускае ў 30 гарадах Беларусі новую ініцыятыву «Наш адказ крызісу». Галоўная ідэя пяцідзённай кампаніі (ад 21 да 25 красавіка) — заклікаць беларускае грамадства з'яднацца дзеля супрацьстаяння эканамічнаму крызісу.

Пакуль кіраўніцтва партыі думала, ці праводзіць новы з'езд, ці працаваць без рэгістрацыі, з Міністэрства юстыцыі паступіў новы званок. Супрацоўнік ведамства паведаміў Аляксею Шэіну, што рашэнне аб нерэгістрацыі партыі прыпыненае.

Афіцыйная прычына — у сувязі з шэрагам зваротаў заснавальнікаў БХД, атрыманнем інфармацыі, якая ўплывае на рашэнне аб дзяржаўнай рэгістрацыі дадзенай партыі. Канчатковае рашэнне будзе прынятае пасля праверкі атрыманай інфармацыі.

Павел Севярынец кажа: «Гэта поўны сюррэалізм. Спачатку адмаўляюць у рэгістрацыі, потым прыпыняюць тое рашэнне. Думаю, што канчатковы вынік будзе вядомы толькі пасля сустрэчы Лукашэнкі з Шварцэнбергам. Наколькі ўдала пройдзе гэтае спатканне».

Калі будзе абвешчана канчатковае рашэнне па БХД, пакуль не паведамляецца.

**ЗП**

# Арцём Дубскі: Выкінулі з камеры



ЗМІЦЕР ПАНКАВЕЦ

15 красавіка з Бабруйскага СІЗА быў вызвалены палітвязень Арцём Дубскі, які знаходзіўся за кратамі ад 13 лютага. Хлопец праходзіў па крымінальнай справе за ўхіленне ад адбыцця «хатняй хіміі» паводле «Працэсу чатырнаццаці». Праз дзве гадзіны пасля вызвалення карэспандэнту «НН» атрымалася пагутарыць з палітвязнем.

**«Наша Ніва»: Як адбывалася вызваленне?**

**Арцём Дубскі:** Прыкладна ў 20.30 прыйшлі да мяне ў камеру і фактычна выкінулі з яе. Правяліператрус, забралі турэмныя рэчы, аддалі цывільныя. Запытаўся яшчэ ў следчага, у які ён бок едзе. Той усміхнуўся, сказаў, што не ў той, куды трэба мне. Потым у Бабруйск прыехала маці і забрала мяне ў Асіповічы.

**«НН»: У прынцыпе, чакаў вызвалення?**

**АД:** Сказаць, што гэта было для мяне вельмі нечакана, не магу. Пасля сустрэчы з адвакаткай Тамарай Сідарэнка меў асцярожную надзею. Рады, што яна спраўдзілася.

**«НН»: Якія ўмовы былі ў СІЗА?**

**АД:** Да мяне адносіліся, як да іншых зэкаў. Нічога асаблівага ў стаўленні да мяне не было. Перанаселенасці ў камерах не было, месцаў хапала. Крыху палепшыліся ўмовы толькі пасля таго, як мае лісты пачалі друкаваць у інтэрнэце. Вельмі важна, калі пра такія справы згадваюць у газетах. Можна паказаць ахоўніку такую публікацыю, і ягонае стаўленне да вязня ўжо мяняецца. Адзіны негатыўны момант звязаны са збіццём, калі міліцыянты пабілі ўсіх пятнаццаць сукамернікаў.

**«НН»: А на здароўі не адбілася?**

**АД:** Колер твару вельмі змяніўся, хваравіты стаў. Калі ў камеру пайшла вада з хлоркай, то вельмі балеў жывот. Аднак зараз нібыта ўсё нармальна.

**«НН»: Навіны з волі неяк атрымоўваў?**

**АД:** Канечне. У камеры быў тэлевізар, які лавіў шэсць каналаў. Прыходзіла шэсць газетаў: «Наша Ніва», «Народная воля», «Камсамолка»... І, натуральна, лісты.

**«НН»: Шмат пісалі?**

**АД:** Штодня прыходзіла па 5-6 лістоў. Цяпер вось у сваім нататніку маю каля 300 адрасоў, з якіх мне дасылалі пісьмы.

**«НН»: Што цяпер? Калі суд?**

**АД:** Мяне вызвалілі пад падпіску аб нявыездзе з краіны. Справа ўжо завершаная. Думаю, што суд адбудзецца цягам двух тыдняў.

**«НН»: І які прагноз?**

**АД:** Перакананы, што справа разваліцца. Не думаю, што мяне вызвалілі, каб зноў пасадзіць за краты, бо які сэнс тады было выкідваць з камеры цяпер?

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

# Прыкметы другой хвалі крызісу

**Белстат апублікаваў трывожныя звесткі аб росце запазычанасці беларускіх прадпрыемстваў. Таксама пасля аднаснага зацішша ў сакавіку попыт на замежную валюту на Беларускай валютна-фондавай біржы зноў пачаў значна перавышаць прапанову.**

Гэта можа быць знакам новага назапашвання фінансавых праблемаў у беларускай гаспадарцы, абцяжаранай усё большым дэфіцытам замежнагандлёвага балансу і падточанай недаверам да нацыянальнай валюты.

На таргах 10 і 15 красавіка абодва дні попыт на даляры перавышаў прапанову на 24 мільёны, 8 красавіка — на 17 млн. 16, 17 і 20 красавіка розніца складала 10—15 мільёнаў штодзень. Астатнія дні апошняй дэкады попыт прыкладна раўняўся прапанове.

Такія нажніцы амаль адпавядаюць найгоршым для золатавалютных запасаў Нацбанку прамежкам канца 2008 году.

Курс даляру на працягу апошняга месяцу вагаецца нязначна, у раёне 2830 рублёў. Нязменнымі застаюцца і суадносіны рубля з валютным кошыкам.

Алею ў агонь валютнага рынку, несумненна, падліла і ацэнка Пуціна на мінулым тыдні, што крэдытная запазычанасць Беларусі дасягае пагрозлівых памераў. Гэтае выказванне мае асаблівае значэнне, калі ўлічыць, што Расія апошнія 15 гадоў была асноўным донарам і крэдыторам Беларусі. Паводле ацэнкі пасла Расіі ў Беларусі Сурыкава, у 2008 годзе памер толькі энергетычнай датацыі дасягнуў 11,5 млрд даляраў. Паводле ацэнак МВФ, у 2009 годзе Беларусь мае патрэбу ў 10,7 млрд даляраў замежных крэдытаў для выканання сваіх фінансавых забавязанняў перад насельніцтвам і замежнымі партнёрамі.

Усе 2000-я гады Беларусь падтрымлівала высокія дзяржаўныя выдаткі, у выніку чаго на сёння золатавалютныя запасы краіны ў прапорцыі да ВУП найніжэйшыя у рэгіёне Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

16 красавіка Белстат апублікаваў чарговыя трывожныя звесткі: запазычанасць беларускіх прадпрыемстваў па крэдытах і пазыках на 1 сакавіка 2009 году склала 42,54 трлн рублёў і павялічылася проці 1 сакавіка 2008 году ў 1,5 разу. Пратэрмінаваная запазычанасць за той жа перыяд вырасла на 47,4% да 633,27 млрд рублёў.

І першая, і другая лічба значна перавышаюць і тэмп інфляцыі, і працэнт дэвальвацыі рубля адносна даляру і еўра.

**Мікола Бугай**

# Рыба лібералізуецца з галавы

**Памочнік Аляксандра Лукашэнкі па эканоміцы Сяргей Ткачоў ініцыяваў істотны перадзел рынку рыбы ў Беларусі.**

Змена ўмоваў працы імпарцёраў рыбы мае на мэце зменшэнне выдаткаў на імпарт, але пры гэтым рэзка вырасце доля Кіраўніцтва справаў прэзідэнта (КСП) на рынку.

Імпарцёры рыбы і морапрадуктаў адгэтуль змогуць пастаўляць у Беларусь толькі сыравіну. Імпарт перапрацаванай прадукцыі, напрыклад, рыбных кансерваў, забараняецца. Тым самым плануецца павялічыць загрузку беларускіх рыбаперапрацоўчых комплексаў, а дадаены кошт мае заставацца ў краіне.

У службе інфармацыі і грамадскіх сувязяў Кіраўніцтва справаў прэзідэнта паведамілі, са спасылкай на памочніка прэзідэнта Сяргея Ткачова, што раней «дзяржаўныя структуры рэспублікі недастаткова ўплывалі на тыя працэсы, якія ідуць на рыбным рынку краіны». «Пастаўшчыкі імкнуліся паставіць як мага больш гатовай прадукцыі ... Імпарцёраў мала хвалявала тое, што нашы з вамі кроўныя асядалі ў тугіх кашальках заморскага дзядзькі», — пераказвае прэс-рэліз службы «Інтэрфакс».

«Калі хтосьці з іх [імпарцёраў] мяркуе, што зможа і далей працаваць па-ранейшаму, ужыўшы некаторыя больш мудрагелістыя метады працы, такіх імгненна ацвярозяць эканамічныя санкцыі», — гаворыцца ў прэс-рэлізе.

Зрабіць тое няцяжка, бо міжведамасную камісію па вызначэнні імпарцёраў рыбы і морапрадуктаў узначальвае... Мікалай Дамашкевіч, шэф Кіраўніцтва справаў прэзідэнта, найбольшага гульца на рыбным рынку, якому падпарадкоўваецца РПГП «Белрыба».

Менавіта «Белрыба» і хоча перахапіць новыя сегменты рынку. У прыватнасці, яна гатовая інвеставаць 12 мільярдаў рублёў у Браслаўскі рыбакансервавы завод.

Каб канкурэнты не рыпаліся занадта, міжведамасная камісія на чале з Дамашкевічам ад 1 мая пазбавіла 16 кампаніяў з 42-х права імпарту ў Беларусь рыбы. Сярод пацярпелых — ААТ «Белбакалея», Універсальная база Гарадзенскага аблспажыўсаюзу, ПГУП «Белкампо», ТДА «Астор і К».



**Мікалай Дамашкевіч стане гаспадаром рыбнага рынку.**

На думку інтэрнэт-газеты afn.by, у КСП прысутнічае жаданне асвоіць грошы на мадэрнізацыю вытворчых магутнасцяў. Што да Ткачова, то дзейнічае ён «не з асабістай выгады — натура ў яго такая, сацыялістычная».

Грандыёзныя планы Ткачова грунтуюцца на тым, што Беларусь па-ранейшаму зможа масава экспартаваць прадукцыю на расійскі рынак. Аднак, мяркуе выданне, Ткачоў забываецца, якімі бессэнсоўнымі аказаліся гіперінвестыцыі ў вырошчванне цукровых буракоў і цукразаводы, пасля таго як Расія абараніла ўнутраны рынак. У выніку Беларусь сутыкнулася з перавытворчасцю.

У 2008 годзе беларускія прадпрыемствы імпартавалі рыбы і рыбапрадуктаў на $277,5, экспарт рачной і азёрнай рыбы склаў $12,8 млн. У тым самым годзе імпарт гатовых прадуктаў з рыбы склаў $57,4 млн. Экспарт жа гатовых прадуктаў з рыбы — 251,99 млн. Ад новых абмежаванняў патэнцыйна выйграюць таксама буйныя перапрацоўнікі кшталту берасцейскага заводу «Санта Брэмар».

**МБ**

# Гішпанія: лакаматывам мадэрнізацыі стала чыгунка

**Сетка хуткасных цягнікоў змяняе працоўную сілу.**

350 км на гадзіну — такую хуткасць развіваюць цягнікі хуткаснай чыгункі, што злучаюць сталіцу Гішпаніі з поўначчу і поўднем.

AVE — Alta Velocidad Espanola — у скароце чытаецца па-гішпанску як «птушка». І гэтыя птушкі хутчэйшыя і сучаснейшыя за сваіх французскіх і японскіх аналагаў. Сетка чыгункі імкліва расце.

Паводле плану ўладаў, да 2020 году 9 з 10 гішпанцаў будуць жыць на адлегласці максімум 50 км ад станцыі хуткаснага цягніку.

Гэтая сетка злучае краіну, падзеленую на рознакультурныя рэгіёны.

Дзякуючы AVE, жыхары гарадкоў, размешчаных нават за 100 км ад Мадрыду, могуць працаваць у сталіцы. Зменшылася таксама загрузка аўтамагістраляў. Хуткасная чыгунка зрабіла непатрэбнымі многія паветраныя злучэнні ўнутры краіны. З Барселоны да Мадрыду можна даехаць за 2,5 гадзіны, тады як на машыне гэтая дарога займае гадзінаў 6.

Гішпанія выкарыстала для інвестыцый у інфраструктуру датацыі ад Еўрасаюзу, якія належаліся ёй як менш развітай краіне. Агульны аб'ём укладанняў у AVE склаў 100 млрд еўра.

Можам марыць, што калісьці і з Мінску ў Берасце ці Гомель можна будзе даязджаць за гадзіну-паўтары.

**МБ**



## СЦІСЛА

### Статыстыка падзення

Аб'ём ВУП эканомікі Арменіі скараціўся за першы квартал 2009 году на 6,1% пры сувымерным з беларускім падзенні экспарту. Тэмп падзення казахскай гаспадаркі склаў 2%. На 5% упаў ВУП Фінляндыі. Гэта ўсё вынікі сусветнага крызісу. Аднак надыходзяць і першыя аптымістычныя сігналы: у сакавіку аднавіўся прамысловы рост у Польшчы, што можа быць знакам хуткага аздараўлення гаспадарак іншых краінаў.

### Заводы — бясплатна

General Motors Corp гатовая аддаць кантрольныя пакеты акцый у сваім еўрапейскім аддзяленні Opel/Vauxhall задарма. Запазычанасці кампаніі такія, што іх абы пазбыцца. Тое самае і з шведскай галіной GM — Saab-ам. Ёсць рызыка, што гэтыя маркі проста перастануць выпускацца.

### Чэхія адмовіла «Аэрафлоту»

Расійская авіякампанія выключаная са спісу прэтэндэнтаў на выкуп чэшскага авіяперавозчыка CSA.

**МБ**

# Беларусь — у Еўропу: хоць тушкай, хоць чучалам

**Жыццё нястомнае на парадоксы: патомны арыстакрат граф Шварцэнберг, міністр замежных справаў Чэхіі, прывёз беларускаму кіраўніку запрашальнік у Прагу і білет у Ватыкан. Каментуе Аляксандр Класкоўскі.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Прэс-сакратар МЗС Андрэй Папоў (злева) выводзіць князя Карэла Ёганэса Ёзафа Норберта Фрыдрыха Антонія Урацiслава Мена фон Шварцэнберга (другі злева) і міністра Мартынава да журналістаў.**

Мінулая пятніца ашаламіла айчынны палітычны бамонд дзвюма навінамі. Па-першае, патомны арыстакрат граф Шварцэнберг, міністр замежных справаў Чэхіі, выканаў ролю паштара і прывёзтакі беларускаму афіцыйнаму кіраўніку запрашальнік у Прагу (нават не чытаўшы, як высветлілася, той ліст). Па-другое, стала вядома, што літаральна днямі Лукашэнка, учарашні ізгой Еўропы, можа сустрэцца ў Ватыкане з пантыфікам. Адвал мазгаўні!

Жыццё нястомнае на парадоксы. Хто б мог падумаць, што збліжэнне Беларусі з Еўропай пачнецца не па прыгожым сцэнары адэптаў ідэі, а вось так — цераз запрашальнік «апошняму дыктатару», які шмат гадоў бэсціў гнілы Захад? Яшчэ болей: што на лаўры пасрэдніка ў дыялогу канфесій замахнецца візітам да Папы не хто іншы, як колішні «праваслаўны атэіст».

Але гісторыя не церпіць умоўнага ладу. Маем тое, што маем.

Апеляцыі знакавых апазіцыйных фігураў, каб Еўропа не наступала на граблі, не спрыялі легітымацыі самі-ведаеце-якога рэжыму, аказаліся марным лямантам у пустыні.

Людзям, што шмат пацярпелі ад гэтай улады за свае погляды ды і проста не трываюць на дух яе хамства, калгаснасці, натуральна, крыўдна, што яны сёння фактычна па-за гульнёй. А вось злы геній, архітэктар жорсткай аўтарытарнай сістэмы, ні на ёту не змяніўшыся, будзе каралём тусавацца сярод палітычнай эліты Старога свету! Зрэшты, агортвае крыўда і на тую эліту, што банальна прадыназміла заслужаных змагароў з дыктатурай. І насамрэч — гнілы Захад, халера яго бяры! Філістэрскае нутро!

Калі ж сур'ёзна, то крыўда — не палітычная катэгорыя.

У прыватнасці, маральныя інвектывы на адрас дзеячаў Еўразвязу («здрадзілі дэмакратыі» і г.д.) прыводзяць толькі да таго, што візіцёры — і Салана, і цяпер вось Шварцэнберг — дэманстратыўна пазбягаюць кантактаў з лідэрамі АДС. Маўляў, не вучыце дзядуляў кашляць!

Ну і наконт легітымацыі.

Паліталогія вучыць, што галоўны складнік легітымнасці ўлады — унутраны. І фармуецца гэная легітымнасць у галовах айчыннага люду. Прасцей кажучы, пакуль народ нейкую ўладу пагаджаецца трываць — яна легітымная, колькі ні кляймуй яе ў пракламацыях як антынародную.

Сёння ж, хоць крызіс і напружыў грамаду, рэйтынг правадыра застаецца тэфлонавым. І нават жаданне кардынальных пераменаў у краіне, як сведчыць незалежная сацыялогія, не асацыюецца ў свядомасці масы з патэнцыялам тытульнай апазіцыі: болей тых, хто лічыць, што перамены хутчэй здольная ініцыяваць улада. Эканамічныя нягоды актуалізуюць пакуль што толькі парадыгму «выжывай хто як можа», а не бунтарскія настроі.

Карацей, аб выспяванні гронак гневу казаць не выпадае. (Асобнае пытанне: а дзе мы апынемся, калі раптам грымнуць забурэнні? Я не ўпэўнены, што пуцяводнай зоркай у такім гіпатэтычным форс-мажоры стане «Малая канстытуцыя» АДС і што на царства паклічуць лідэраў тытульнай апазіцыі.)

Вось і мусіць Брусель ладзіць дачыненні з тым, хто рэальна кантралюе краіну. Прычым Еўропа падкрэслівае, што ад дэмакратычных каштоўнасцяў і ад падтрымкі грамадзянскай супольнасці не адракаецца.

Еўрасаюз проста адклаў убок той інструментарый (санкцыі, ізаляцыя і г.д.), які за дзесяць гадоў не даў плёну. Калі не лічыць, што сінявокая рэспубліка толькі мацней падсела на расійскую іголку.

Натуральна, няма ніякай гарантыі, што новы план — спакваля размагніціць дыктатуру праз уцягненне ў сілавое поле Еўропы — спрацуе. Гэта стане бачна толькі праз гады.

**Як бы хтосьці ні ставіўся да Лукашэнкі, візіт у Ватыкан падкрэсліць духоўную сувязь Беларусі з Еўропай.**

І сюжэт, між іншым, варыянтны. У тым ліку ён залежыць ад гнуткасці дэмакратычных сілаў у самой Беларусі. Ад іх здольнасці перабудавацца канцэптуальна ды арганізацыйна, адаптавацца да вось гэтых парадаксальных рэалій. І раскалупаць тыя трэшчыны, што непазбежна будзе даваць сістэма — ужо пад адным толькі ціскам фінансава-эканамічнага крызісу.

Карацей, для апазіцыі шлях адзін: спыніць скаргі на еўрапейскае кідалава (хаця наконт «дарожнай карты» варта праядаць Брусэлю плех і надалей) і вучыцца гуляць на ўнутраным полі па-новаму.

Што ж да жарсцяў вакол запрашэння Лукашэнкі ў Прагу, то, па-першае, яшчэ невядома, ці паедзе. Ёсць цэлы шэраг «але», пачынаючы ад нежадання дражніць расійскага мядзведзя.

Па-другое, праблема ўвогуле штучна драматызаваная. Лагічна разглядаць гэта як запрашэнне Беларусі. І тады зразумелая опцыя «без аніякіх папярэдніх умоваў». Бо Беларусь, паводле змоўчання, ёсць часткай еўрапейскай цывілізацыі. Таму вяртанне яе ва ўлонне Старога свету, выпраўленне гістарычных вывіхаў — гэта звышзадача. І хай гэты шлях пачынаецца як мага хутчэй — «хоць тушкай, хоць чучалам», як у тым анекдоце.

Можна сказаць і так: хай гэты шлях пачынаецца, пакуль не позна. Скажыце, вы вось верыце ў філантрапічныя матывы Расіі, якая, са слоў Пуціна, гатовая і надалей даваць крэдыты, нягледзячы на пагрозлівы для Беларусі ўжо зараз цяжар пазыкаў?

«Праз два месяцы ўсе забудуць, быў ці не быў Лукашэнка ў Празе», — сказаў у размове са мной аналітык Валеры Карбалевіч. А палітолаг Андрэй Фёдараў нагадвае: «Савецкі Саюз быў у значна большай ступені дыктатарскім рэжымам. Тым не менш, Брэжнеў ездзіў па ўсім свеце».

Эксперт сумняваецца, што Лукашэнка паляціць у Прагу. Дадамо: куды больш эфектным можа стаць візіт у Ватыкан. Чакаецца сенсацыйная сустрэча Лукашэнкі з Папам. Зноў жа: як бы хтосьці ні ставіўся да персоны візіцёра, але для поліканфесійнай Беларусі гэта стане сімвалічнай падзеяй. І таксама падкрэсліць яе гістарычную духоўную сувязь з Еўропай. А ўжо айчынным каталікам дык сто пудоў горш не стане. І, наогул, гэта спрацуе на ўмацаванне талерантнасці ў нашым грамадстве.

Што ж да «Усходняга партнёрства», то, са слоў Фёдарава, «пакуль цяжка гаварыць аб ягонай светлай будучыні»: занадта ўжо сур'ёзныя праблемы паўсталі перад Еўрасаюзам, як, урэшце, і перад усім светам. «Але праграма дае Беларусі шанец наблізіцца да аб'яднанай Еўропы, — лічыць эксперт. — Хоць з шэрагу прычынаў гэты шлях наша краіна будзе праходзіць цяжка і марудна».

Такім чынам, непараўнальна важнейшым, чым персанальнае прадстаўніцтва ў Празе, ёсць сёння пытанне аб тым, наколькі эфектыўным акажацца ўдзел Беларусі ў новай праграме ЕС.

І тут таксама — поле для палітычнай гульні. Варта прыглушыць шэкспіраўскія жарсці і паварушыць глуздамі. У прынцыпе, усё толькі пачынаецца. Гэта акурат той выпадак, калі крот гісторыі капае неўпрыкмет.

# Стражаў пракалоўся

**Кітай падазрае афіцыйны Мінск у «падвойнай гульні» і пагражае ахаладжэннем міждзяржаўных адносінаў. Прычына — выстава пра Тыбет і кніга намесніка дырэктара Інстытуту Канфуцыя пры БДУ.**




Пазіцыю кітайскага пасольства агучыў праз агенцтва «Інтэрфакс» кіраўнік лукашэнкаўскага аналітычнага цэнтру «ЕсооМ» Сяргей Мусіенка. Кітайцы моцна незадаволеныя дзейнасцю мінскага аддзялення Інстытуту Канфуцыя. Інстытут гэты быў створаны пры Белдзяржуніверсітэце на кітайскія грошы, а ўзначальвае яго былы рэктар БДУ **Васіль Стражаў (на фота)**, для якога гэтая справа стала сінекурай. Задача Інстытуту — прапаганда кітайскай культуры і ведаў пра Кітай. Ва ўсім свеце гэта кітайская структура, і толькі ў Беларусі, з улікам асаблівага характару беларуска-кітайскіх адносінаў, кітайцы пайшлі на тое, што гэты Інстытут стаў структурай БДУ.

Інстытут Канфуцыя зладзіў выставу фатографа Аляксея Андрэева «Кітайскі Тыбет», на якой, паводле кітайскіх дыпламатаў, праблематыка асвятлялася аднабакова — па ёй заставалася ўражанне «духоўнага спустошэння» і не знайшлі адлюстравання дасягненні апошніх гадоў, прынесеныя ў Тыбет Кітаем, накшталт хуткаснай чыгункі.

Нараканні кітайскага боку выклікала і кніга намесніка дырэктара Інстытуту Канфуцыя Ігара Малевіча «Азіяцкі трохкутнік драконаў», якая ўтрымлівае сцверджанні накшталт «50-гадовая акупацыя Тыбету», «Тайвань — мадэль будучага Кітаю?»

С.Мусіенка заявіў таксама, што «ні фатограф, ні намеснік дырэктара Інстытуту Канфуцыя не прынялі запрашэнне амбасады КНР прыйсці ў госці і абмеркаваць гэтае пытанне». А тое, што БДУ — дзяржаўны універсітэт, а тыпаграфія «Беларускі дом друку» належыць Кіраўніцтву справаў прэзідэнта, дало кітайскім дыпламатам падставу расцаніць гэтыя факты як выяўленне афіцыйнага стаўлення беларускай дзяржавы. І Кітай, паводле словаў С.Мусіенкі, гатовы згарнуць гандлёва-эканамічнае, палітычнае і культурнае супрацоўніцтва з Беларуссю.

А гэта ўжо атас, бо лукашэнкаўскаму ўраду нагвалт патрэбны валютны своп на 20 млрд юаняў.

«На адкрыцці маёй выставы прысутнічалі прадстаўнікі пасольства Кітаю і ніякіх прэтэнзій на мой адрас, як аўтара фотаздымкаў, не прагучала, — дзівіцца Аляксей Андрэеў. — І ў пасольства мяне ніхто не запрашаў, і пытанняў не ставіў. Я б з радасцю абмеркаваў усе пытанні, звязаныя з выставай».

Фотамастак дадаў, што ў ягоных творах няма нічога, што б магло абразіць пачуцці прадстаўнікоў Кітаю і выклікаць такія жарсці. «Абвінавачанні цяпер выглядаюць дзіўна, — кажа ён, — пасля таго, як выстава паўтара месяцу дэманстравалася ў бібліятэцы імя Янкі Купалы». Дый кніга прафесара Малевіча, што выклікала абурэнне, як стала вядома, яшчэ два гады таму была выдадзеная ў Расіі (выдавецтвы «Харвест» і «АСТ») і нараканняў не выклікала. Сам Ігар Малевіч ад каментароў адмовіўся, спаслаўшыся на тое, што яшчэ не азнаёміўся з інфармацыяй.

Са словаў Мусіенкі, Кітай не выдасць кітайскай візы ані Стражаву, ані Малевічу.

Мусіенка — асоба, звязаная са спецслужбамі, ён удзельнічаў у прапагандысцкім абслугоўванні рэферэндуму 2004 і выбараў 2006 гадоў. Пасада дырэктара Інстытуту Канфуцыя — грашовая сінекура. Пасля скандалу яна яўна застанецца вакантнай.

**Сямён Печанко**

# Верхні горад: праект рэгенерацыі

**Адмыслоўцы УП «Мінскпраект» сканчаюць працу над архітэктурным праектам адбудовы Верхняга гораду.**

Яны ставілі перад сабой задачай рэстаўрацыю, аднаўленне страчанага і аднаўленне гістарычнага асяроддзя як адзінага цэлага.

З вынікамі працы архітэктараў знаёміць часопіс «Архітэктура і будаўніцтва». Што варта адзначыць у першую чаргу: спецыялісты «Мінскпраекту» галоўнай мэтай сваёй працы паставілі аднаўленне цэласнасці гісторыка-культурнага асяроддзя шляхам адбудовы страчаных дамінантаў.

Пра адбудову адной з іх — царквы Святога Духа — СМІ ўжо паведамілі. Яна дазволіць завяршыць галоўную прасторавую вось плошчы Свабоды.

Дэталёвы план, распрацаваны архітэктарамі, утрымлівае канкрэтныя прапановы па аднаўленні разбуранага ў 1960—1990-я гг. комплексу будынкаў на пл. Свабоды пад нумарамі 19, 21, 23 (так званы Малы Гасцінны двор каля праваслаўнага сабору), аднак гэтая задума адкладзеная на перспектыву, а пакуль там абмяжуюцца добраўпарадкаваннем тэрыторыі.

Распрацоўшчыкі праекту мяркуюць, што гістарычнаму цэнтру гораду ў першую чаргу трэба надаць публічны, а не адміністрацыйны характар, дзеля чаго прапануецца змяніць функцыі наяўных аб’ектаў. Паводле меркавання спецыялістаў, гістарычнаму цэнтру моцна не хапае кавярняў, мастацкіх галерэяў, майстэрняў.

Адным з істотных кірункаў працы архітэктараў ёсць спалучэнне гістарычнай забудовы і сучасных элементаў добраўпарадкавання, малых архітэктурных формаў, скульптурных кампазіцыяў, якія б падкрэслівалі характар і гістарычную атмасферу ўсёй прасторы. Асаблівую ўвагу збіраюцца надаць дарожнаму пакрыццю: вулкі Верхняга гораду вымасцяць брукам, а не пліткай. Акрамя таго, тут плануецца стварыць амаль суцэльную пешаходную зону, пакінуўшы транспарту толькі вуліцу Гандлёвую, што ідзе паўз гару ўздоўж Свіслачы і злучае Нямігу з Інтэрнацыянальнай.

Пры аднаўленні цэласнасці гістарычнага цэнтру архітэктары лічаць неабходным захаваць планіровачную структуру, якая мусіць стаць непарушнай каштоўнасцю і пунктам адліку для любога праектавання і ўкаранення ў гістарычны цэнтр.

Над праектам працаваў аўтарскі калектыў архітэктараў Г.Перлінай, А.Дубрынскай, А.Хворык, В.Агеенка, В.Новікавай, А.Кашанскага, А.Хадзякова.

**СП**



**Гэтак Стары горад будзе выглядаць з вышыні птушынага палёту**

## Грэка-каталікі Мінску звярнуліся да Лукашэнкі

**з просьбай перадаць для адбудовы царкву Святога Духа ім.**

Грэка-каталіцкія (уніяцкія) вернікі сталіцы звярнуліся да А.Лукашэнкі з просьбай дазволіць ім пабудаваць храм на месцы царквы Святога Духа ў Верхнім горадзе.

У звароце зазначаецца, што цяпер у Мінску чатыры грэка-каталіцкія парафіі: «Дзякуючы візіту ў Беларусь дзяржаўнага сакратара Ватыкана кардынала Тарчызіо Бертоне, адна з парафій атрымала магчымасць праводзіць набажэнствы ў капліцы па вул. Арджанікідзе. Тры іншыя карыстаюцца гасціннасцю рыма-каталіцкіх парафій.

Ужо даўно наспела неабходнасць пабудаваць у сталіцы Беларусі грэка-каталіцкі храм».

Аўтары звароту вітаюць аднаўленне царквы Святога Духа, знішчанай у 1936 г. На іх думку, вяртанне храму канфесіі, якая яго збудавала, падкрэсліла б унікальны поліканфесійны характар Мінску. Пад зваротам падпісаліся доктар гістарычных навук Анатоль Грыцкевіч, доктар багаслоўя Ірына Дубянецкая, доктар фізіка-матэматычных навук Юры Хадыка, пісьменнік Уладзімір Арлоў, археолаг Эдвард Зайкоўскі і яшчэ некалькі соцень вернікаў.

Пачатак аднаўлення запланаваны на пачатак лета. Запланавана, што ў будынку размесціцца філарманічная зала.

**АГ**

# Чаго чакаць ад маленькага Ляўковіча?

**Старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі Анатоль Ляўковіч даў скандальнае інтэрв'ю газеце Адміністрацыі прэзідэнта «Советской Белоруссии» пад назвай «Апазіцыя павінна супрацоўнічаць з палітычнай сістэмай, а не ставіць ёй палкі ў колы».**

Гутарку рабіў філосаф Вячаслаў Оргіш, які яшчэ ў снежні перайшоў на старонкі «СБ». «Сучаснае жыццё фарміруе запыт на палітыкаў, арыентаваных на тую катэгорыю выбаршчыкаў, якія галасуюць за грамадзянскія правы і не адмаўляюць у лаяльнасці існуючай палітычнай сістэме. Мяркуючы па ўсім, у сістэмным палітычным працэсе цалкам магчыма з'яўленне партыі, гатовай абапірацца на галасы той часткі электарату, які крытычна ўспрымае айчынную рэчаіснасць, аднак не збіраецца ісці на барыкады», — пісаў тады В.Оргіш.

Здаецца, аналітык знайшоў такога палітыка у выглядзе лідэра БСДП. Ляўковіч кажа: «У Беларусі заўсёды будуць карыстацца попытам тыя палітычныя сілы, якія арыентаваныя не на раскачванне сітуацыі, а на яе стабілізацыю. Людзі інтуітыўна адчуваюць, што менавіта такі курс у А.Лукашэнкі, які зарэкамендаваў сябе рашучым праціўнікам «аранжавых» праектаў. Не дазволіў радыкальнай прыватызацыі, захаваў рабочыя месцы, зрабіў упор на падтрымку сацыяльных стандартаў, кіраўнік дзяржавы замацаваў свой аўтарытэт у вачах выбарцаў».

І гэта не апошняя порцыя кампліментаў у бок кіраўніка дзяржавы. Ляўковіч працягвае: «Нам варта прызнаць, што Лукашэнка, нягледзячы на супярэчнасці і цяжкасці свайго прэзідэнцкага кіравання, выканаў гістарычную місію па пераапачатковым уладкаванні краіны пасля развалу СССР, фарміраванні беларускай дзяржаўнасці і яе захаванні».

І яшчэ: «Аграмаднае значэнне мелі палітычныя якасці кіраўніка дзяржавы, які змог выбудаваць у Беларусі жорсткую «вертыкаль» выканаўчай улады, якая змагла стабілізаваць эканоміку і палітыку краіны, не дала разгуляцца ці то дэмакратыі, ці то ахлакратыі».

Рыторыка Ляўковіча супадае з прапагандысцкай схемай лукашэнкаўскіх СМІ. Яна хісткая: апаненты пярэчаць, што Беларусь выглядае белай варонай сярод еўрапейскіх дэмакратый, а эканамічныя вынікі кіравання Лукашэнкі больш чым сумнеўныя. У краіне не сфармаваўся прыватны капітал, а сярэдні заробак утрая меншы, чым у Польшчы. Ляўковіч гне сваё: «Беларускія дэмакраты неабдумана сталі ў непрымірымую апазіцыю да Лукашэнкі. Яны павялі барацьбу за адхіленне ад улады Прэзідэнта (у тэксце з вялікай літары — ЗП), якога абрала большасць народу. Палітычна гэта азначала, што дэмакраты ўзяліся змагацца з самім народам».

Выказаўся Ляўковіч і пра ролю БСДП. «Мы павінны сур'ёзна супрацоўнічаць з кіроўнай элітай».

Напрыканцы гутаркі Ляўковіч кажа, што прапаведаваў такія ідэі цягам многіх гадоў.

Публікацыя ў «Советской Белоруссии» выклікала шок унутры Аб'яднаных дэмакратычных сілаў, сустаршынёй якіх з'яўляецца Ляўковіч. «Спачатку трэба разабрацца, ці гэта пазіцыя асабіста Анатоля Ляўковіча, ці ўсёй партыі, — кажа старшыня АГП Анатоль Лябедзька. — Калі гэта пазіцыя партыі, то яны ўвайшлі ў дзверы не той кааліцыі. Зрэшты, чаго чакаць ад маленькага Ляўковіча, калі нават вялікая Еўропа гандлюе дэмакратычнымі каштоўнасцямі».

Яшчэ больш жорсткі ў сваіх ацэнках аказаўся лідэр Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі. «Наша партыя будзе ставіць пытанне на бліжэйшым пасяджэнні АДС аб выключэнні з кааліцыі Анатоля Ляўковіча і прыпынення сяброўства БСДП. Гэта прынцыповае пытанне. Калі ў складзе АДС знойдуцца заступнікі Ляўковіча, то БНФ абвесціць аб выхадзе з кааліцыі», — кажа Л.Баршчэўскі.

Унутры партыі інтэрв'ю старшыні БСДП таксама падтрымліваюць далёка не ўсе. Не выключана, што бліжэйшым часам сацыял-дэмакраты пачнуць ініцыяваць адстаўку свайго старшыні. Найхутчэй, што пытанне Ляўковіча будзе разгледжана на пасяджэнні Прэзідыуму АДС у сераду 22 красавіка.

**Зміцер Панкавец**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Анатоль Ляўковіч: «Хай Гайдукевіч яшчэ дарасце да ўзроўню Ляўковіча!»

Сам Анатоль Ляўковіч не з вельмі вялікай ахвотай гаворыць пра дадзеную публікацыю. «Оргіш прапаноўваў мне на выбар апублікаваць інтэрв'ю ў «Советской Белоруссии» ці ў «Народнай волі». Я выбраў першы варыянт, бо наклад у «СБ» 400 тысячаў асобнікаў, а мы да гэтага і імкнёмся, каб дайсці да людзей. Дзе знайсці лепшую пляцоўку?» — пытаецца А.Ляўковіч.

«Я яшчэ не знаёміўся з рэакцыяй на гэтую публікацыю, таму нічога канкрэтнага не магу сказаць. Гавораць, што Ляўковіч хоча стаць новым Гайдукевічам? Дык хай Гайдукевіч яшчэ дарасце да ўзроўню Ляўковіча! Я выступаю за дэмакратычную заможную Беларусь», — кажа старшыня БСДП.

Пытаюся, чаму падчас інтэрв'ю Ляўковіч выказваўся толькі пра станоўчыя моманты працы Лукашэнкі і ні разу не згадаў адмоўныя. «Ну там крыху было, але не ў адкрытую. Ну вы самі разумееце, чаму я абыходзіў вострыя моманты». — «Не, не разумею, растлумачце». — «Тады напішыце, што я 18 гадоў крытыкаваў Лукашэнку, трэба некалі і пахваліць», — адказвае А.Ляўковіч.

**ЦЫТАТЫ**

### Прыхаваныя датацыі Расіі Беларусі ў 2008-м склалі 11,5 млрд

Расійскі пасол у Беларусі Аляксандр Сурыкаў у інтэрв'ю БелаПАН: «Калі ў 2006-м сусветная цана [на газ] была 293 даляры, Беларусь плаціла амаль 47 даляраў, гэта значыць менш на 247. У 2008 годзе сусветная цана на газ склала 409 даляраў, Беларусь плаціла 128, гэта значыць на 281 менш. ... Прыхаваныя прэферэнцыі на розніцы ў цэнах на энерганосьбіты ў 2006 годзе прынеслі эканоміцы Беларусі 9,4 млрд даляраў, а ў 2008 годзе — 11,5 млрд».

### Жыхарам Магілёва варта падрыхтавацца

Прадстаўнік кампаніі «Балеар Белмед» Васіль Камароў на радыё Тут.бай пра беларускі рынак прэзерватываў: «Пра Магілёўскую вобласць не магу нічога сказаць, хіба што яе жыхарам трэба падрыхтавацца, бо навукоўцы ўстанавілі, што кожныя 22 гады ў Магілёўскай вобласці здараецца эпідэмія сіфілісу».



### Апяць жастачайшая ацвественнасць

А.Лукашэнка на адрас ураду з пагрозай адправіць у адстаўку частку міністраў: «Усе рашэнні будуць прынятыя найрадыкальнейшым чынам, калі мы не выйдзем на тое, што самі запланавалі».

### Каб парцейныя са сваімі стрыжанымі дзеўкамі на антамабілях каталіся

Каментар чытача да артыкулу пра апошні суботнік «Папрацавалі — і добра» на сайце «Советской Белоруссии»: «Я падмятаў, бяліў і фарбаваў. Горад стаў чысцейшы, больш утульны, прыгожы. І ўбачыў Бог, што гэта добра! Колькі зарабіў, не ведаю. Колькі пералічыў, ведаю — дзённы заробак. Прапаную ў наступны суботнік, раз такія дзялы, пакінуць мяне ў спакоі — усё адно дзённы заробак забераце, не спытаўшы. Дару! Дзяржаве ж гэта галоўнае. Каб парцейныя са сваімі стрыжанымі дзеўкамі на антамабілях каталіся. (Шолахаў)».

## Уладзіміру Конану — 75

Патрыярху беларускай філасофіі 23 красавіка спаўняецца 75 гадоў. Нарадзіўся ён у вёсцы Вераскава Навагрудскага раёну.

Уладзімір Конан даследуе гісторыю філасофіі, эстэтычнай думкі, культуры, фальклор.

Адам Мальдзіс, калега і паплечнік, кажа пра Конана: «Уладзімір хіба не адкрываў новых крыніцаў, даследуе ўжо вядомыя, але робіць надзвычай карысныя абагульненні. Даследуе стан філасофскай думкі, найперш яе рэлігійны складнік: яго пяру належыць каштоўная для навукі кніга пра ксяндза Адама Станкевіча. Цяпер, як і раней, Уладзімір Конан піша, як думае, шчыра».

**ЛК**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Палітбюро-2009

# Русалка на аблоках

Працяг са старонкі 1.

Пры гэтым — з добрых юрыстаў. З юрыстаў, якія ведалі сабе цану.

А спадарыні Наталлі «цаны» ніхто не даваў. Ходзіць такая прывабная, круглявая дзяўчына. Амаль бландынка. Але яшчэ пры гэтым і працуе. І працаздольнасці ёй было не займаць. Праўда, гавораць абазнаныя людзі, вельмі своеасаблівай. Бо праца юрыста можа быць падобнай да працы майстра пэндзля, а можа — да працы звычайнага капііста. Можна вырашаць найскладаныя задачы дзяржаўнага будаўніцтва, а можна і перапісаць чужы закон, змяніўшы, скажам, фармулёўку «Рэспубліка Венесуэла» на «Рэспубліка Беларусь». Дык вось, гавораць тыя самыя абазнаныя людзі, ніякага вечнага рухавіка спадарыня Пяткевіч не вынайшла. Але ёй задачы такой і не ставілі. А работа «па аналогіі» таксама заслугоўвае павагі.

Хоць у адной сферы нашая гераіня ўсё-такі стала першапраходцам. Менавіта на яе слабыя плечы быў ускладзены абавязак юрыдычна абслугоўваць працэс будаўніцтва — гм-гм... — «саюзнай дзяржавы». І калі працэс гэты пайшоў угару, адзін з калегаў спадарыні Наталлі выпадкова выявіў, што падчас чарговай змены структуры Адміністрацыі яго раптам панізілі — перавялі з галоўных спецыялістаў у вядучыя, а з вядучых у галоўныя перавялі Наталлю Уладзіміраўну.

І нават падзенне яе пратэктара Валерыя Ціхіні з алімпу судовай улады аніяк не адбілася на яе лёсе. Проста парады ёй цяпер давалі зусім іншыя людзі.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Гарбата ці кава?

Ветэраны адміністратыўнай дзейнасці кажуць, што кар'ерны свой рост спадарыня Наталля выседзела. Можна спрачацца, наколькі гэтая злая характарыстыка справядлівая. Але штосьці ў гэтым ёсць. Папершае, яна сапраўды, як мы ўжо адзначылі, надзвычай працаздольная. А па-другое, мужчыны сталага веку і першай сівізны проста любілі размаўляць з гэтай амаль бландзінкай, ад якой за вярсту чуўся сталічны мажорны дух. Гэта ж таксама мастацтва — сядзець і размаўляць за кубачкам гарбаты з бравым Сяргеем Посахавым (памятаеце такога?), слухаць мудрыя кіруючыя парады Міхаіла Мясніковіча, разагнаць нуду Уладзіміру Падгайнаму, а заадно знайсці з ім супольную мову... А пры гэтым яшчэ і працаваць трэба! Я, дурань, на каву перайшоў, каб усё паспяваць. А нашая гераіня — гарбату, амаль выключна гарбату! Але — у добрай кампаніі.

Кампанія, па ўсім відаць, дзейнічала на спадарыню Наталлю танізуюча. Настолькі танізуюча, што пасля нараджэння першага дзіцяці яна вярнулася на працу ўжо праз два месяцы. Было відаць, што менавіта тут яе сапраўднае жыццё. Не кар'ера, а менавіта жыццё.

Хаця і кар'еру спадарыня Пяткевіч рабіла паспяхова. Кожная чарговая рэарганізацыя Адміністрацыі ўзносіла яе ўсё вышэй. І вось яна ўжо — начальнік аддзелу, вось — начальнік упраўлення ў складзе глаўку. А вось і прызначаны міністрам Міхаіл Падгайны нясмела папрасіў кіраўніка дзяржавы зрабіць ласку і прызначыць Наталлю Уладзіміраўну намеснікам міністра. Але кіраўнік дзяржавы адмовіў.

### Нядоўгі раман з прэсай

Сёння ўжо цяжка дазнацца, у які менавіта момант і хто прапанаваў Аляксандру Лукашэнку прызначыць Наталлю Пяткевіч на пасаду прэс-сакратара. То бок ідэя, ідэя «бландынкі» неяк сама сабой лунала ў паветры з канца 1995 г., калі знішчальніка «Пагоні» і натхняльніка «Дзяцей ілжы» (быў такі «дакументальны» фільм) Уладзіміра Замяталіна ўжо нават неяк непрыстойна здалося гэтак называць (а пасаду ён займаў іншую). У ролі прэс-сакратара паспелі пабыць і Міхаіл Шаршавіцкі, і Мікалай Барысевіч... А сапраўднай бландынкі ўсё не было.

Абазнаныя людзі казалі: шукаючы прэтэндэнтку на гэтую пасаду, Урал Латыпаў (спярша — першы памочнік прэзідэнта, потым — міністр замежных справаў, праз пасаду — кіраўнік Адміністрацыі) да Наталлі Пяткевіч вялікай ласкі не меў. І не таму, што не любіў піць гарбату з прыемнымі суразмоўніцамі. Не любіў доўгіх беззмястоўных гутарак. Але выйсця не было. Шмат людзей у Адміністрацыі ставіліся да сваёй суразмоўніцы па гарбаце вельмі добра. Напрыклад, памятны памочнік прэзідэнта Мікалай Ананьеў, які неяк рашуча зблізіўся з спадарыняй Наталляй у спробах манапалізаваць пад эгідай спорту ўвесь латарэйны бізнэс краіны.

Дый кандыдатуры іншай не было, бо прэс-сакратар павінен быць хаця б вядомы прэзідэнту. А спадарыня Пяткевіч — па пасадзе, нічога асабістага! — паспела ўжо неяк і прымільгацца.

Так пачаўся яе раман з прэсай.

Раман, які скончыўся несумненнай перамогай. Наталля Уладзіміраўна «з'ела» рэдактара самай тыражнай недзяржаўнай газеты Беларусі. Дакладней — «в Белоруссии». Вядзецца пра «Комсомольскую правду», якую спадарыня Пяткевіч чамусь не залюбіла.

Чуткі былі розныя. Напрыклад, пра дзве канкурэнтныя латарэйныя кампаніі, якія змагаліся за манапольнае права размяшчаць рэкламу на газетных плошчах «КП». Спадарыня Пяткевіч нібыта спрыяла адной і не любіла другую. А газета настойліва не жадала адмаўляцца ад такога выгаднага рэкламадаўцы... Невядома адкуль ўзяўся адміністратыўны ціск і ўсё рос, рос — і газета стамілася змагацца з тым ціскам, ад якога патыхала ці то самым крутым тытунём беларускай журналістыкі, ці то самай выкшталцонай парфумай у кіруючай эліце краіны. Штрафы дарабілі справу: рэдактару давялося сысці.

### Росквіт

Больш адміністратыўных перамогаў у Наталлі Уладзіміраўны не было. Але іх і не патрабавалася. Яна заўсёды магла спасладца на колькасць тэлевізійных сюжэтаў, прыдуманых не ёю; артыкулаў, напісаных не ёю; сустрэчаў з замежнымі журналістамі, якія і без яе гатовыя па першым чыху спяшацца на сустрэчу з такім самабытным (ці такім адыёзным?) лідэрам невялікай цэнтральнаеўрапейскай дзяржавы. Урэшце, Аляксандр Лукашэнка ўжо даўно ўспрымаецца не як «выпадковы прэзідэнт», а як прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

**Наталля Пяткевіч**

нар. у 1972 у Мінску (дзявочае прозвішча — Краўчанка).

Скончыла ў 1994 Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Ад 1994 да 2001 займала пасады ад вядучага спецыяліста да начальніка ўпраўлення дзяржаўнага і міжнароднага права галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

12 снежня 2001 прызначаная прэс-сакратаром прэзідэнта Беларусі (змяніла Мікалая Барысевіча).

25 лістапада 2004 прызначаная намеснікам кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта.

9 студзеня 2009 прызначаная першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта.

27 сакавіка 2009 выйшла замуж за намесніка старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандра Мартыненку.

Мае навуковую ступень кандыдата юрыдычных навук.

Мае сына ад першага шлюбу.

А паколькі спасылацца было на што, гэта задавальняла ўсіх, у тым ліку і самога Лукашэнку. Так спадарыня Наталля стала намесніцай кіраўніка Адміністрацыі, змяніўшы на гэтай пасадзе галоўнага юрыста краіны прафесара Аляксандра Абрамовіча.

Вось тут ёй і давялося праявіць свой прафесіяналізм. У сэнсе — наяўнасць юрыдычнай адукацыі і пэўнага жыццёвага досведу.

Гэта толькі злыя языкі чыноўнікаў мянцяць, што спадарыня Пяткевіч нідзе, акрамя Адміністрацыі прэзідэнта, не працавала. Добразычлівыя сцвярджаюць адваротнае. Студэнты юрфаку на досвітку беларускага капіталізму (1993—1994 гг.) з задавальненнем абслугоўвалі розныя фірмы і фірмачкі, дапамагаючы ім складаць розныя дамовы, афармляць статуты дый блукаць па чыноўніцкіх кабінетах. Гавораць — і гэта цалкам праўдападобна — што менавіта ў такой фірмачцы пачынаўся і працоўны шлях самай уплывовай жанчыны Беларусі. І нібы менавіта ў гэты перыяд Наталля Пяткевіч паспела зразумець, што такое чыноўніцкае самадурства, і як важна для фірмы, асабліва для той, што займаецца замежнаэканамічнай дзейнасцю, каб гэтага самадурства было як мага меней.


БЕЛТА

Наталля Пяткевіч, Юрый Жадобін, Уладзімір Макей.

Вось адкуль — з асабістага досведу — узялася ідэя «аднаго акна» для рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання! Праўда, досведу хапіла толькі на ідэю. Можна сабе ўявіць, з якім менавіта выглядам слухалі выступы на гэтую тэму прадстаўнікі раённых і абласных выканкамаў. Фактычна ім прапаноўвалася раптоўна адмовіцца ад асноўнай крыніцы папаўнення асабістага бюджэту. І прапаноўвала гэта маладая бландынка. Адмовіцца ад грошай, якія самі плылі ў рукі!

Нельга сказаць, што спадарыня Наталля заставалася ў той момант такой ідэалісткай, каб не разумець марнасці сваіх намаганняў. Проста за выкананне адпаведных нарматыўных актаў яна не адказвала. А паперкі — вось жа, напісала! І вельмі нават падобна да расійскіх! Такія ж прагрэсіўныя! Амаль што Чубайс! Толькі ў элегантным касцюмчыку.

## На безназоўнай вышыні

Так працягвалася да таго часу, пакуль Аляксандр Лукашэнка не надумаў пачаць пошукі шляхоў дыялогу з Захадам. Паводле падлікаў аднаго дасужага назіральніка (не маіх!), гэта мусіла супасці з першым годам жыцця Мікалая Аляксандравіча Лукашэнкі. Менавіта тады ў ЗША раптам паляцеў чалавек з статусам нефармальнага прадстаўніка «апошняга дыктатара Еўропы». Да гэтага падобным чынам, паводле чутак, лётаў у тую ж краіну былы харызматычны брунет Міхаіл Мясніковіч. Цяпер паляцела вытанчаная бландынка, якая надумала пабываць на магіле аднаго з любімых сваіх універсітэцкіх выкладчыкаў, што паспеў эміграваць незадоўга да яе ўзыходжання на вышыні ўлады.

Хаця, можа быць, аніякага палёту і не было. А толькі чуткі. Але — сцвярджаюць тыя ж чуткі — вярнулася спадарыня Наталля з ЗША з поўнай перакананасцю ў тым, што дыялог магчымы. Трэба толькі арганізаваць яго правільна. Скарэктуем дзяржаўную ідэалогію — і ўсё тут.

І яе кінулі на ідэалогію. Не на сельскую, падкрэслім, гаспадарку, а на ідэалогію. Замест акадэміка Рубінава, які паспяхова «дастаў» і святароў, і навуковую супольнасць, і прэсу, і, верагодна, самога прэзідэнта, сваёй прамудрасцю. Гэта, уласна, і стала першай прыкметай нашай «адлігі».

Цяпер уплывовасць спадарыні Наталлі дасягнула піку. Вышэй падымацца няма куды. У прэм'ер-міністры яе не прызначыш. Ад простага міністэрскага партфелю яна паспяхова адмовілася. А звышзанятасць Уладзіміра Макея ператварыла спадарыню Пяткевіч у рэальнага кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта. Праўда, без адпаведнага запісу ў працоўнай кніжцы, але затое і без той адказнасці, якая накладаецца гэтым запісам. Цяпер ад яе залежыць калі не ўсё, дык шмат чаго. Тэлеканалы і газеты, МЗС і Мінкультуры, Акадэмія Навук і суды прыслухоўваюцца да яе звонкага голасу і шукаюць яе ласкі.

Можна толькі ўявіць сабе, як праводзіць новы галоўны ідэолаг краіны нарады рэгіянальнай «ідэалагічнай вертыкалі». Выходзіць на трыбуну маладая прывабная жанчына, добра апранутая, з ласкавай усмешкай, і пачынае свой выступ шматзначнай фразай:

— Я плавала ў басейне, і мне прыйшла ў галаву думка...

**Пасля нараджэння першага дзіцяці Пяткевіч вярнулася на працу ўжо праз два месяцы.**

А ў зале сядзяць тры дзесяткі цётак з камуністычнымі шыньёнамі на галовах, у якіх галовы гэтыя баляць не з прычыны адсутнасці ў іх раёне (цэлым раёне!) басейну, а з зусім іншай прычыны. У кагосьці бунтуе Анжаліка Борыс. Дзесьці ідзе цяжба з недзяржаўнай газетай. Хтосьці атрымаў паведамленне (о, жах!) пра прыезд самога Мілінкевіча... Ім бы зразумець: адліга гэтая ўсур'ёз ці на колькі? А ім, сыходзячы з небывалых вышыняў, — і не сыходзячы нават, а так, ляніва пагойдваючыся на галінах, з ласкава-халоднай паблажлівай усмешкай пушкінскай русалкі, якая сядзіць на тых галінах, у сваім казачным свеце, — пачынаюць няголасна граць пра басейн, пра Раду Еўропы. Матэрыі важныя, але да практычнага жыцця гэтых бядотных цётак з шыньёнамі яны дачынення не маюць. Прычым басейн і Рада Еўропы да арганізацыі «Дажынак»? Да працы БРСМ? Да збору сродкаў на дапамогу Абхазіі і Паўднёвай Асеціі? Ды ні пры чым! Заводзьце сабе песні, кажыце казкі —толькі фармулюйце думку гранічна выразна, каб пажаданне начальства не ўгадвалі, а чулі! Гэтага патрабуе чыноўніцкая этыка!

Але спадарыня Наталля наўрад ці спусціцца з сваіх галінаў. Не з галінаў нават — з аблокаў! Яна ўжо там, наверсе. Яе мадэль паводзінаў — прыклад для пераймання. Не Юлія Цімашэнка нават, а якая-небудзь бравая Вандэрбільдыха, з якой і спаборнічаць увогуле немагчыма, хіба што сшыць палантын з афрыканскага тушкана і ўпрыгожыць яго пазалочаным чайным сіцечкам. Яна хоча жыць прыгожа: багата, ездзіць у «майбаху», званіць праз «верту», лавіць захопленыя погляды ўжо не палкоўніка Посахава, а Тома Круза і Брэда Піта, а яшчэ лепей — прынца Гары. Яна хоча мець магчымасць блішчаць, а не пабліскваць, як і трэба брыльянту, а не стразу.

А дзе блішчаць? Тут? У застойна-саўгаснай Беларусі?

Не, у Еўропу! Толькі ў Еўропу! На худы канец, у Амерыку!

Вы будзеце смяяцца, паважаны чытач. Але менавіта гэтае натуральнае жаданне новага пакалення беларускай эліты, якому пах урадавага пылу больш знаёмы, чым пах свежаўзаранай зямлі, і дае некатрую надзею на тое, што мы ў Еўропе ўсё-такі будзем.

**Аляксандр Фядута,**
**спецыяльна для «НН»**




Пасля другога шлюбу Наталля Пяткевіч змяніла прычоску, але не характар.

Раней у тым самым цыкле: Другі твар. Уладзімір Макей (№14).

# Турма напярэдадні амністыі

**Былы палітзняволены Сяргей Парсюкевіч расказвае пра рэаліі беларускай пенітэнцыярнай сістэмы.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Сітуацыя, падобная да маёй, не ёсць нечым незвычайным у Беларусі. І для праяваў праўнага самаўпраўства зусім неабавязковая наяўнасць палітычнага складніка ў крымінальным працэсе. Акрамя таго, што суды выносяць вырак на замову ўладных структураў ці проста кіруючыся інтарэсамі розных зацікаўленых асобаў (так званае тэлефоннае права), у краіне ўся сістэма правасуддзя грунтуецца на разнастайнай статыстычнай справаздачнасці. І часам пэўнае дзеянне, кваліфікаванае артыкулам КК з меншымі санкцыямі, «перарастае» ў больш цяжкае злачынства і наадварот. Суды сталі выносіць рашэнні на аснове «ўнутранага пераканання суду». Як гэта разумець? Калі бок абвінавачвання «здолеў» пераканаць суд у вінаватасці абвінавачанага, то і доказы па справе ўжо неабавязковыя ? Я крымінальных справаў у поўным аб'ёме на зоне не вывучаў (няма там такой магчымасці), але тое, што бачыў і пра што гаварылі людзі, кажа менавіта пра такі стан рэчаў у краіне.

Калі «прасануць» падазраванага, чалавек прызнаецца і ў спаленні Хатыні. Гэта ж не простае збіццё. Тыя, хто катуе, у гэтых справах сталі сапраўднымі майстрамі — выкарыстоўваюць супрацьгаз (калі рукі прымацаваныя кайданкамі, а шланг перацiснуты, адчуванні, мякка кажучы, непрыемныя), б'юць па пятах, прымушаюць доўга стаяць, не пускаюць у прыбіральню, падвешваюць. Асобнае месца тут займаюць ін'екцыі галаперыдолу, пасля якіх чалавека проста вырочвае. Усе такія дзеянні «праваахоўнікаў» адназначна кваліфікуюцца Крымінальным кодэксам, вось толькі надта ж рэдка гэта бывае.

### Сон у дзве змены

Не быў ні ў адной камеры, дзе не было б рэальнага перапаўнення. На 12 месцаў звычайна 16—18 чалавек, а то і болей. Спаць даводзіцца пазменна, па два чалавекі на адзін ложак. Звычайна гэта нары з металічных пласцінаў, на якія кладзецца наматрацнік, зроблены ў сярэдзіне 80-х мінулага стагоддзя. Адлеглась між пласцінамі такая, што матрац праваліваецца. Яшчэ даюць ватную падушку, з якой чамусьці вылазіць медны дрот. Падушка такая цвёрдая, што вошай можна без праблемаў раздушыць. З вошамі, дарэчы, у СІЗА-1 (Валадарка) сутыкаўся двойчы, і змагацца з імі абодва разы даводзілася з дапамогай рук і добрага зроку — іншыя сродкі барацьбы з педыкулёзам там не прынятыя.

### «Ламаць рэжым ніхто не будзе!»

Падследныя і асуджаныя маюць права на ветлівае і гуманнае стаўленне, але супрацоўнікі ізалятараў і турмаў ставяцца да іх як да быдла. Чалавечая годнасць увесь час зневажаецца, чалавек трымаецца ў пастаянным напружанні, робіцца ўсё, каб яму было як мага горш. Правілы ўтрымання падрабязна рэгламентуюць паводзіны зняволеных і супрацоўнікаў адміністрацыі, але «турэмшчыкі» патрабуюць зусім іншага. А пачынаеш змагацца за свае правы, можна і дубінкай атрымаць (залятаюць у камеру хлопцы ў масках, мабыць, вельмі сарамлівыя — не жадаюць, каб бачылі іх твары, і пайшлі махаць направа і налева). Таксама можна апынуцца ў штрафным ізалятары, а ўжо само знаходжанне там акрамя як катаваннем нічым не назавеш. У ШІЗА удзень нават прысесці толкам няма дзе, ні пачытаць, ні пакурыць, матрацы і бялізна нават на ноч не выдаюцца. Калі на Валадарцы стаўленне да зняволеных было больш-менш, дык у Жодзінскай турме становішча рабілася невыносным. Першае, што рабіў оперупаўнаважаны ў Жодзіне, калі я разам з іншымі хлопцамі прыбыў туды з Валадаркі — выклікаў да сабе ў кабінет і біў там людзей па вуху. Пры гэтым прыгаворваў: «Гэта табе не Валадарка, ламаць рэжым тут ніхто не будзе!» А ніхто «ламаць» і не збіраўся, людзі і так без ежы і сну былі амаль сутки. Але, як высветлілася пасля, Жодзінская турма — рай у параўнанні з ШІЗА-2 у Віцебску, куды пасля «навядзення парадку» ў Жодзіне быў пераведзены для гэтых жа мэтаў вядомы ў колах зняволеных спадар К.

У Ш-й калоніі быў яшчэ адзін «гуманны» метад «выхавання» асуджаных. Там ёсць дзве клеткі пад паставымі вышкамі (прыкладна 2х2 метры) і «загон» каля памяшкання дзяжурнага па калоніі. Дык вось, калі ў «выхавальнікаў» з'яўляюцца прэтэнзіі да асуджаных, чалавека проста зачыняюць у гэтыя клеткі, і стой там, пакуль з цябе не злітуюцца. Хлопцы казалі, прастойвалі там цэлы дзень, нават узімку, а вопратка самі разумееце якая. Гэта працей за ШІЗА, але як стыкуецца з заканадаўствам? А яшчэ над асуджанымі ўвесь час вісіць магчымасць пазбаўлення права на спатканне з роднымі, права на перадачу, на тэлефонны званок.

### Мыццё ва ўнітазе

Яшчэ адна асаблівасць беларускіх турмаў — наяўнасць на вокнах, акрамя кратаў, «веек» (пласцін з металу). Гэтыя «вейкі» цалкам засланяюць агляд , у найлепшым выпадку бачны кавалачак неба або асфальту, ды і свежага паветра яны ў камеры не дадаюць. Па-мойму, у цывілізаваных краінах такія вычварэнні даўно адышлі ў нябыт...

Асобна хочацца апісаць санвузел. Звычайна гэта ўнітаз, да якога падведзеная труба з вадой. На трубе ёсць кранік, і менавіта пад ім даводзіцца мыцца, чысціць зубы і мыць посуд — практычна ва ўнітазе. Пры гэтым унітаз звычайна знаходзіцца на ўсеагульным аглядзе. Хтосьці есць, а хтосьці... У камерах, бывае, знаходзіцца па трыццаць і больш чалавек, дык ужо выбачайце... Хлопцы ж, якія прайшлі некаторыя раённыя ізалятары, расказвалі, што там у прыбіральню выводзяць два разы на суткі, а калі стане зусім няўсцерп, дык у камеры ёсць бак, вось у яго народ і «ходзіць». Дарма што на двары XXI стагоддзе.

### Камяні ў хлебе

Належных па рацыёне 90 грам мяса ў суткі ніхто з маіх знаёмых не бачыў. А яшчэ на зонах пякуць свой хлеб. Каменьчык у хлебе ў Жодзінскай турме каштаваў мне зуба, некалькі чалавек расказвалі пра аналагічныя выпадкі (пры яшчэ двух я прысутнічаў). Не ведаю чаму, але там даюць такую гарачую ежу, што з'есці за адведзены на гэта час немагчыма. Але тое нікога не хвалюе, гэта цяжкасці тых, хто туды патрапіў. А хто жадае пакаштаваць кактэйль з зонаўскай макароны і сечкі, можа гэта зрабіць у сталоўцы Ш-й калоніі. Там жа можна атрымаць асалоду ад экзатычнай стравы, прыгатаванай шляхам выварвання чагосьці падобнага да кількі з наступным дбайным перамешваннем. Адмысловы каларыт гэтаму далікатэсу надае тое, што вантробы з рыбы не вымаюцца.

### Няма зубоў — няма праблем

Барані Божа захварэць на зоне. Забалеў зуб — адразу прапануюць вырваць. З гэтай прычыны ў мужчын, старэйшых за 40 гадоў, адсутнічае шмат зубоў. Яшчэ адна з найстрашнейшых праблем на зоне — сухоты. З такой ежай у такіх умовах жыцця гэтая хвароба не можа не квітнець. Калі мяне этапавалі з Жодзіна ў Шклоў, са мной і іншымі хлопцамі больш за гадзіну ў адным купэ ехалі тры хлопцы з адкрытай формай сухотаў. Спачатку яны былі ў спецыяльных масках, але , калі сталі задыхацца, давялося зняць, і мы ўсе былі без намёку на засцярогу ад інфекцыі...

### Чатыры тысячы за два тыдні

Цікавая і тэма прыцягнення асуджаных да працы. У Шклове за паўмесяца працы ў чэрвені мне заплацілі 4 тысячы рублёў. Асуджанаму залічаюць на яго асабісты рахунак 25% ад зарплаты (астатняе ідзе на ўтрыманне, аліменты і г.д). За месяц я б тэарэтычна зарабіў 32 тысячы. Як гэта стыкуецца з працоўным заканадаўствам? І такая сітуацыя з усімі і на ўсіх зонах. А мужыкі ж рэальна робяць патрэбныя рэчы, якія карыстаюцца попытам. Да працы там прыцягваюць, падобна, не людзей, а бясплатных рабоў.

І я сам, і іншыя людзі пісалі скаргі на ўмовы ўтрымання. Гэтыя лісты накіроўваліся і ў пракуратуру, і ў Дэпартамент выканання пакаранняў, і ў ААН, і ў АБСЕ. Але далей за кіраўніцтва калоній нічога не пайшло. Значыць, за правы чалавека ў нашай краіне павінны змагацца людзі на волі. Хтосьці можа сказаць, што няма чаго змагацца за правы людзей, якія парушылі закон. Але ў зняволенні, паводле маёй ацэнкі, знаходзіцца 15% людзей, якія нічога супрацьзаконнага не зрабілі, у адносінах да адсоткаў дваццаці адназначна можна было б абысціся пакараннем, не звязаным з пазбаўленнем волі, і яшчэ ў 20% тэрміны пакарання відавочна завышаныя. Ёсць катэгорыя асуджаных, якія трапілі на зону праз перакананні, што ідуць у разрэз з палітыкай улады. Іх смела можна назваць «палітвязнямі», і такіх каля 5%.

Шмат чаго яшчэ можна напісаць пра жыццё ў беларускіх турмах і калоніях. Можна доўга абурацца, што там людзей пазбаўляюць не толькі волі (як трэба паводле закону), але і наагул усяго, што патрэбна нармальнаму чалавеку. Але гэта ўсё словы. Становішча і жыццё там словамі апісаць немагчыма: каб зразумець, усё гэта трэба перажыць. Я там прабыў усяго паўгоду, а людзі сядзяць там гадамі, дзесяцігоддзямі.

**Амністыя-2009**

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу 15 красавіка прыняла законапраект «Аб амністыі ў сувязі з 65–годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў». Зараз у Беларусі ў турмах 37 578 чалавек, з іх 46% — за здзяйсненне злачынстваў, скіраваных супраць уласнасці і парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці.

**Амністыя, што мае адбыцца цягам 2009 году, закране** асобаў, якіх становіча характарызуюць падчас адбывання пакарання. У адпаведнасці з праектам закону, будуць вызваленыя ад крымінальнай адказнасці непаўнагадовыя, цяжарныя жанчыны, пенсіянеры, інваліды, хворыя на актыўную форму сухотаў, ВІЧ–інфікаваныя, ветэраны баявых дзеянняў, чарнобыльцы. Таксама вызваляюцца людзі, што атрымалі раненні пры выкананні абавязкаў падчас службы, якія здзейснілі злачынствы, што не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі (да 2 гадоў) і менш цяжкія злачынствы (да 6 гадоў пазбаўлення волі). Будуць вызваленыя ад крымінальнай адказнасці жанчыны і адзінокія мужчыны, якія маюць непаўнагадовых дзяцей.

Іншыя катэгорыі асобаў будуць вызваляцца ад пакарання ў выглядзе арышту, абмежавання волі, накіравання ў дысцыплінарна–вайсковую частку, пазбаўлення волі пры асуджэнні: за злачынствы, што не маюць вялікай грамадскай небяспекі; за менш цяжкія злачынствы — пры адбыцці не менш чвэрці тэрміну пакарання; за асобныя цяжкія эканамічныя злачынствы: крадзеж, махлярства, прыўлашчванне альбо растрату, крадзеж з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі ў буйным і асабліва буйным памеры (за выключэннем асобаў, якія здзейснілі злачынства ў складзе арганізаванай групы) — пры адбыцці не менш траціны тэрміну пакарання; за іншыя злачынствы — калі да заканчэння тэрміну пакарання засталося менш за год.

**Амністыя не будзе распаўсюджвацца** на асобаў, да якіх раней выкарыстоўвалася амністыя альбо памілаванне і якія ізноў здзейснілі наўмысныя злачынствы. Не трапяць пад амністыю асобы, якія не кампенсавалі нанесены злачынствамі ўрон (за выняткам вышэй названых ільготных катэгорыяў грамадзян), злосныя парушальнікі парадку падчас адбывання пакарання, прызнаныя асабліва небяспечнымі рэцыдывістамі, асуджаныя да пажыццёвага зняволення і тыя, хто здзейсніў наўмысныя забойствы альбо гвалт, злачынствы супраць дзяржавы, стварыў злачынную арганізацыю, удзельнічаў у ёй, людзі, якія здзейснілі карупцыйныя злачынствы.

Прагназуецца, што на волю выйдзе 4344чалавекі. Агулам розным формам амністыі падлягае 29 тыс. 594 чалавек.

**Сяргей Парсюкевіч**

лідэр прадпрымальніцкага руху. Быў асуджаны на 2,5 году зняволення нібыта за збіццё міліцыянта ў ізалятары на Акрэсціна, дзе прадпрымальнік адбываў суткі за ўдзел у мітынгу пратэсту 10 студзеня 2008 г. Сам Парсюкевіч сцвярджаў на судзе, што насамрэч міліцыянеры жорстка збілі яго. Быў вызвалены ў жніўні 2008 г. дзякуючы прынцыповай пазіцыі ЗША, якія за адмову вызваліць палітвязняў увялі супраць беларускага рэжыму эканамічныя санкцыі.

# Падлеткавая жорсткасць і дарослая мяккасць

**У Краснаполлі, што на Магілёўшчыне, дачка міліцыянта з сяброўкай збілі малодшую на год школьніцу. Маці збітай звярнулася да журналістаў, бо кажа, што не можа дабіцца праўды ў міліцыі ды пракуратуры.**

«Люда і праз некалькі месяцаў пасля таго млела, скардзілася, што не адчувае ног, дагэтуль часта хвалюецца, кепска спіць», — амаль не плача маці дзяўчынкі Юлія Ганчар. У бальніцы з траўмамі галавы дзяўчынка праляжала 23 дні.

Увечары 14 лістапада 2008 г. у гарадскім парку ў Краснаполлі да 14-гадовай Люды Ганчар з яе сяброўкай прычапіўся малодшы школьнік: кінуў граззю, абмацюкаў. Атрымаўшы адпор, прыгразіў патэлефанаваць сяброўцы. І патэлефанаваў. Пасярод парку дзяўчат спынілі Марыя Р. ды Настасся С. Далей паміж дзяўчатамі, як напісана ў пратаколах, «на глебе непрыязных адносінаў адбылася канфліктная сітуацыя», у выніку якой Людміле «былі прычыненыя цялесныя пашкоджанні ў выглядзе драпінаў твару і кровападцёкаў на валасістай частцы галавы злева». Судова-медыцынская экспертыза аднесла гэтыя пашкоджанні да катэгорыі лёгкіх. Па словах жа Люды і яе сяброўкі, Марыя спрабавала выціснуць ёй вочы пальцамі, а Настасся падрапала дзяўчынцы твар. Пацярпелая потым сказала, што абедзве нападніцы былі п'яныя. Гэта пацвердзіць назаўтра Насця, якая прыйдзе разам з маці да Ганчароў выбачацца, а таксама сведкі. Але на экспертызу дзяўчат так і не адвезлі.

Пасля збіцця Люда страціла прытомнасць, яе адвезлі ў бальніцу, а адтуль — у міліцыю. У РАУСе маці і дачку развялі па розных кабінетах. Пакуль Юлія Аляксееўна размаўляла з участковым інспектарам, яе дачку агледзеў медэксперт. Паводле закону (арт. 10.19 КаАП РБ), такая экспертыза праводзіцца толькі з пісьмовай згоды пацярпелага альбо яго бацькоў, калі пацярпелы — непаўналетні. Ю.Ганчар сцвярджае, што такой згоды не давала і паперы не падпісвала. Пасля візіту ў РАУС Людзе стала кепска, але, па словах маці, педыятр бальніцы адмовіўся яе шпіталізаваць.

Юлія Ганчар гаворыць, што пазней яе з дачкой некалькі разоў палохалі расправай: тэлефанавалі на мабільны, у палату да дачкі прыходзілі яе крыўдзіцелькі, а ёй асабіста ў прысутнасці яе старэйшай дачкі Вольгі намеснік начальніка Краснапольскага РАУС Драчоў нібыта пагражаў расправай за зварот у пракуратуру. Жанчына неаднаразова звярталася ў праваахоўныя органы, пісала скаргі на імя генпракурора. «Я дабіваюся, каб была распачатая крымінальная справа. Дачка правяла ў бальніцы 23 дні, яна дагэтуль не можа прыйсці ў сябе», — тлумачыць сваю пазіцыю маці Люды і звяртае ўвагу на недакладнасці ў працы праваахоўнікаў. Так, у раённай пракуратуры яе запэўнілі, што ў дачыненні дзяўчат заведзеныя адміністрацыйныя справы, а адпаведныя адміністрацыйныя пратаколы нібыта былі накіраваныя ў суд (ліст ад 5 снежня 2008 г. за подпісам пракурора раёну Зоі Аляксюцінай). Аднак з вызначэння суддзі Краснапольскага раёну ад 8 студзеня 2009 г. вынікае, што гэтыя пратаколы ў суд не паступалі.

«Міліцыянер камусьці пагражаў? Не можа гэтага быць! — здзівіліся ў Краснапольскім РАУС. — Камісія праводзіла праверку паводле заявы Юліі Ганчар, але факт пагрозаў не пацвердзіўся».

Раённы пракурор Зоя Аляксюціна паведаміла, што ў мінулым месяцы пастановай пракуратуры справа Людмілы Ганчар была спыненая за адсутнасцю доказаў злачынства. «Мы атрымалі ад Юліі Ганчар 11 скаргаў, у асноўным яна скардзілася на няпоўнае, на яе думку, расследаванне акалічнасцяў збіцця яе дачкі», — распавяла пракурор. Паводле яе словаў, была праведзеная камісійная судмедэкспертыза, якая выявіла, што пагаршэнне здароўя Людмілы, на якое ўказвала яе маці, з'яўляецца не наступствам інцыдэнту. «У дзяўчынкі абвастрылася захворванне, якое ў яе выявілі яшчэ тры гады таму», — патлумачыла пракурор.

«Гэта вельмі непрыгожая гісторыя, — перажывае галоўная доктарка Краснапольскай цэнтральнай раённай бальніцы Галіна Марозава. — У нас тут была праверка, прыязджалі адусюль: з раённай пракуратуры, з абласной. Але парушэнняў з боку медыкаў не выявілі. Юлія Ганчар хацела атрымаць ад нашага хірурга заключэнне, выдаць якое мае права толькі судмедэксперт», — патлумачыла спадарыня Галіна.

Юлія Ганчар не пагадзілася з высновамі міліцыі і пракуратуры. Яна падазрае праваахоўныя органы ў бяздзейнасці і перавышэнні службовых паўнамоцтваў, а таксама незаконным вызваленні вінаватых ад крымінальнай адказнасці. І таму жанчына звярнулася да прэсы.

**Сямён Печанко**



# Вілянчук пабудаваў дом за 60 еўра

**Жыхара Вільні Тэадораса Малінаўскаса могуць назваць стваральнікам антыкрызіснага дому.**

23-гадовы хлопец здолеў пабудаваць дом за 200 літаў (каля 60 еўра).

Так студэнт Літоўскай мастацкай акадэміі, будучы скульптар, даказаў, што ўласны дом можна паставіць без вялікіх высілкаў.

Праўда, гэты дом невялічкі — усяго 15 квадратных метраў. На першым паверсе — працоўны кабінет, на другім — спальня.

Ля дома завяршаецца будаўніцтва двух верандаў.

За некалькі соцень літаў Тэадорас набыў мацавальныя элементы ды мантажную пену.

«Рэшту я сабраў на будоўлях і звалках. Матэрыяламі ахвотна дзяліліся людзі, што будавалі ўласныя дамы, дарылі непатрэбныя ў гаспадарцы рэчы», — кажа Т. Малінаўскас.

«Праўда, мне пашанцавала, што бацька выдзеліў участак пад будаўніцтва — на звалцы я б яго дакладна не знайшоў», — сказаў будучы скульптар.

**delfi паводле lrytas.lt**

# Амерыканскія цішоткі з «Пагоняй»



Амерыканская інтэрнэт-кампанія Zazzle.com прапануе беларусам сувеніры, цішоткі і кепкі як з афіцыйнай, так і з нацыянальнай сімволікай.

Зайшоўшы на старонку інтэрнэт-кампаніі, прысвечаную прадукцыі для беларускіх кліентаў, можна пабачыць досыць разнастайны асартымент сувеніраў і вопраткі.

Пры гэтым вытворца прапануе выбар: цішоткі, кепкі, торбы, кубкі, куфлі, паштовыя канверты, дыванкі пад кампутарную мыш і нават кухонныя фартухі, аздобленыя як афіцыйнай, так і нацыянальнай сімволікай, а таксама выявай гарадской сімволікі Мінску.

Zazzle.com — амерыканская стартап-кампанія з гадавым прыбыткам у чвэрць мільярда даляраў. Прапануе кліентам з усяго свету рэкламную і сувенірную прадукцыю з самымі рознымі лагатыпамі і сімволікай.

**СП**



# Край белай птушкі

**Ёсць у нашай краіне куток, нібы наўмысна пакінуты людзьмі птушкам — Асвейшчына.**
Піша **Сяргей Харэўскі**.

Тысячы іх гняздуюцца тут, сотні тысячаў робяць прыпынак па дарозе ў вырай, а для некаторых вырай — у Беларусі. Сюды яны імкнуцца ўзімку з палярных шыротаў.

Асвейскае возера. Улетку тут гняздуюцца высакародныя белыя чаплі, безліч белых буслоў і столькі чаеккірляў, што белым бель у вачах. Цяжка даць веры, што некалі гэта быў заможны і абходжаны край. Сёння гэта памежная зона, тупік, міма якога прайшлі ўсе дарогі.

Край Яна Баршчэўскага, Ігната Храпавіцкага, Напалеона Орды. Шчасна і мірна перажыўшы XIX стагоддзе, ён быў дашчэнту спапялёны ў вайну апошнюю. Цяпер Асвейшчына — знелюднелы рай для птушак.

### Край Завальні

Лес на сумежжы Полаччыны і Асвейшчыны — дрымучы, чорны, не падобны да светлых сасоннікаў вакол Мінску. Скрозь гушчар віхляе пакручастая Дрыса. А на другім яе беразе — светла-светла. Там краявід месцамі нагадвае тундру. На месцы колішніх палеткаў усё задзірванела ды парасло балотнымі імхамі. І мільярды пярэстых красак увесну расквечваюць далягляд.

У Дзёрнавічах на беразе Дрысы засталіся рэшткі шыкоўнага парку. Вёска гэтая некалі належыла пану фон Тэшэ, адстаўному расійскаму генералу, герою 1812 году. Расповеды пра дзівакаватасць гэтага старасвецкага пана дасёння бытуюць у ваколіцах. Слухаючы іх, разумееш, адкуль узяліся байкі шляхціца Завальні.

Між Дзёрнавічамі і Задзежжам ляжаць пусткі, рэдаклессе, балаціны. Сапраўдная Поўнач. То тут, то там блішчыць вада. Сетка рэк на Асвейшчыне — найгусцейшая ў Беларусі. Амаль усю ваду адсюль збірае Дзвіна, толькі на крайняй поўначы вада сцякае рэчкай Сінюхай праз Латвію, дзе яе завуць Зілупэ, у Расію, у слыннае Чудскае возера.

### Курганы

Задзежжа — вялікая вёска сярод пустак. Уражвае, што тут амаль няма садоў. Уздоўж дарог курганы, курганы. Асвейшчына шматкроць была полем бязлітасных і працяглых войнаў. Курганы ля гарадзішча Урагава, курганы ў Бароўцы, у лясах над Свольнаю высачэзная Французская Гара.

Непадалёк — Каханавічы. Вёска на ростанях, тут нарадзіўся Ігнат Храпавіцкі, паэт, асветнік ды фальклярыст. Пан Храпавіцкі з суседзямі, панамі Убры і Шчытам, распрацаваў праект скасавання паншчыны яшчэ ў 1850 г. Яго не зразумелі. Калі ж у 1861 г. касавалі прыгон, Храпавіцкі быў узнагароджаны медалём «За труды по освобождению крестьян» і абраны маршалкам дваран Віцебскай губерніі. Ён напісаў «Погляд на паэзію беларускага народа» з дадаткам назіранняў над асаблівасцямі беларускай мовы — першай гісторыка-параўнальнай характарыстыкі нашага фальклору.

Дзеці вызваленых ім сялянаў на чале з бальшавікамі пусцілі дымам барочны палац Храпавіцкіх. Засталіся адно чысты лужок, дзве сажалкі ды старая прысада з вячыстымі ліпамі, хвоямі ды лістоўніцамі.

### Святая гара

У вёсцы Стралкі, што над рэчкаю Вужыца, дарога разыходзіцца на Асвею і на Лісна, вёску над чароўным возерам, што аточана, бы ружанцам, курганамі ды крыніцамі ў дзікіх лясах. Ля Стралкоў ёсць Святая гара. Побач з гарой знаходзіцца Святое возера, у якім здаўна забаранялася лавіць рыбу.

### Ліснянскае возера

Самае старажытнае паселішча ляснога краю — вёска Лісна, нібы галандскае мястэчка на каналах, прытулілася на мысе між возерам Ліснянскім і рэчкаю Свольнаю. Каляровыя шчыты фасадаў глядзяць на ваду скрозь пярэстыя феерверкі кветак. Вабяць зручныя для стаянак берагі, шырокія пясчаныя берагавыя водмелі, празрыстая да дна «срэбная» вада, раскошныя лясы.

На возеры пануе трымцлівая благавейная ціша. Зрэдзьчас, матлянуўшы чорным, шызым ды белым пер'ем, нібы індзейскі правадыр, у ваду вакамгненна ўдарыць арлан, каб кіпцюрамі-восцямі працяць рыбіну. Так, той самы арлан, што на гербе ЗША. Гэта самая вялікая наша драпежная птушка гняздуецца ў гэтых глухіх мясцінах.

Лісна — самае старажытнае паселішча ляснога краю. Гэтую вёску цар калісьці падарыў расійскаму пісьменніку Фанвізіну.

Ад паўночнага берагу Ліснянскага возера пачынаецца Расія.

### Царкоўна

У вёсцы Царкоўна два гады таму я сустрэў 102-гадовую Алену Глінскую. Гэта жыццярадасная кабета, нібы Маленькі Прынц, штодзень назірала за заходамі сонца над возерам, перасоўваючы свой услончык. Уразіла яе сакавітая, чыстая беларуская мова, песні, расповеды пра Купалле, пра былую веліч вёскі, пра рэпрэсіі і апошнюю вайну. Саветы, кажа Алена Глінская, горшыя за нацыстаў, бо немцы прыйшлі і сышлі, а саветы здзекваліся з людзей несупынна, вывозілі, расстрэльвалі, адбіралі дабро ... Са скрухаю баба ўспамінала, як раней паразовы званоў тузіну цэркваў, касцёлаў луналі па ўсім Асвейскім возеры, як вакол былі ахайныя палі збажыны і лёну, «як пойдуць касцы ў хвалі сакаўное травы, нібы лебедзі плывуць, у белых кашулях» (Божа, якая мова!). А цяпер — усё хмызам зарасло. Спе-

**Асвейскае возера**

другі па велічыні натуральны вадаём Беларусі. Плошча вады складае 53 кв. км. Востраў — 5 кв. км. З захаду на ўсход Асвейскае распасціраецца больш як на адзінаццаць, а з поўначы на поўдзень — амаль на восем кіламетраў.



СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

**Здзічэлае Асвейскае возера. Парэшткі старых кладак.**




**Асвея**

на паўднёвым беразе Асвейскага возера. Насельніцтва 1,3 тыс. чалавек. 37 км ад чыгуначнай станцыі Верхнядзвінск на лініі Полацк—Дзвінск.

Асвейскія гарадзішчы адносяцца да пасяленняў балцкіх пляменаў. Першае летапіснае ўпамінанне — 1503 г. Шматкроць знішчалася маскоўскімі войскамі. У 1749 г. пераходзіць ва ўладанне да менскага ваяводы Яна Аўгуста Гільзена. Тут былі пабудаваныя велічны палац і прыгожы касцёл, разбіты вялікі парк, гімназіюм, дзейнічаў шпіталь пры кляштары.

вы бабы Алены на сконе дня над Асвеяй я не забуду ніколі.

### Асвейскае возера

Асвейскае возера то набліжаецца да дарогі, то аддаляецца. Бывае, у ранішнім тумане ці ў вечаровай смузе супрацьлеглы бераг не праглядаецца — возера ўражвае памерамі. Яго плошча больш за 53 кв. км. За тысячы гадоў вялізную сваю частку яно аддало балотам. У ветранае надвор’е вадзяная маса перамешваецца да дна і моцна насычаецца кіслародам, а ўлетку добра праграваецца. Таму тут багата рыбы, аж 22 віды. Жыве тут і вялізарная папуляцыя ракаў.

### Шведскае мястэчка

Мястэчка Асвея, што на ўзбярэжжы, — самае паўночнае гарадское паселішча Беларусі. Яму больш за тысячу гадоў. Пра ягоных заснавальнікаў гаворыць назва: свеўскае, свейскае, г.зн. шведскае. І тысячу, і паўтысячы гадоў таму Падзвінне было аб’ектам вялікай цікавасці скандынаўскіх гасцей.

Пра гэта сёння са скрухаю ўзгадваецца ў Асвеі, дзе няма гатэлю, рэстарану і нават, *pardonnez-moi*, грамадскае прыбіральні. Так што, едучы туды, закідайце ў багажнік усё для жыцця — аж да пітной вады.

З 1924 г. па 1959 г. Асвея была цэнтрам раёну. У 1925 годзе *з мэтай лепшага абслугоўвання нацыянальных меншасцяў* у Асвеі быў створаны яўрэйскі нацыянальны савет. Сёння ў Асвеі ад былой велічы засталіся сталоўка, пара крамаў і бетонныя пліты ў якасці пляжу.

Славутасцю Асвеі быў вялізарны палац, збудаваны ў XVIII ст. мінскім ваяводам Янам Аўгустам Гільзенам. Хорам з пяці корпусаў з чатырма галерэямі выглядаў зверху вялізнай птушкай з распасцёртымі крыламі і здзіўляў планіроўкай: галоўных пад’ездаў было чатыры, па ліку пораў году; унутраных уваходаў — дванаццаць, па ліку месяцаў; пакояў і залаў было па колькасці тыдняў у годзе, вокнаў — па ліку дзён. Тут была люстраная бальная зала ў стылі Людовіка XV.



Палац Гільзена ў Асвеі.



СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

Камень на востраве, у які трапляе маланка.

**Наваполацк—Дзёрнавічы—Чапаеўскі (Вялікае Сяло і Красілаўка)—Царкоўна—Лісна—Асвея—Востраў.**

Можа калісьці яго адбудуюць у якасці гатэлю?

Прысады старадаўніх дрэваў уздоўж каналаў, па якіх паны каталіся ў гандолах, нагадваюць цяпер нейкі фантастычны трапічны лес...

### Востраў

Галоўны гонар цяперашняе Асвеі — Востраў. Бязлесыя схілы на поўдні строма абрываюцца да вады. На вяршынях, схілах і ля падэшвы ўзгоркаў раскіданыя валуны. Пра некаторыя ёсць нават паданні. А ў адзін камень увесь час шугае маланка... Востраў на Асвейскім возеры самы вялікі ў нашай краіне — 5 кв. км. Ёсць тут два дагістарычныя гарадзішчы: Гарадок і Перуноўка. Некалі было сяло з балцкай назваю Ду (палітоўску «два») з уласным прыходам і царквой Раства Багародзіцы. Да вайны вёска Востраў налічвала 65 двароў. Апошнія астраўляне з’ехалі ў 1970 г. Сёння тут гойсае па колішніх палетках паўдзікі табун мясцовай конна-спартовай базы.

Востраў адабрала ў чалавека прырода. Вакол яго на возеры гняздуе паўтара дзесятка відаў вадаплаўных птушак. У пералётах з выраю і ў вырай на возера сядаюць яшчэ 18 відаў. На востраў па апошнім лёдзе прыходзіць цяжарная ласіха і па першым лёдзе сыходзіць з падгадаваным у бяспецы ласянём. Тут гойсаюць барсукі, шашкі, куніцы. Развяліся ўжо і бабры, выдры, норкі, андатры. Але галоўны тут персанаж — стары казёл Барыс, які, як грозны вартавы, сустракае ўсіх гасцей і радасна бяжыць гуляцца-бадацца.

Увосень, калі начныя халады расфарбуюць лісце і чараты ў тысячы барваў, над возерам стане белымбела ад лебедзяў і буслоў, вядомых і невядомых птушак, што збіраюцца адсюль у далёкую Птушыную Дарогу. А калі ўвесь гэты зямелы край ухутаюць снежныя сувоі, і ён пераўтворыцца ў неабсяжную ледзяную пустыню, сюды залятуць белыя пардвы-курапаткі, а за імі і белыя палярныя совы. І сярод гэтае белае цішы пачуецца раптам адно самотны царкоўны звон.

## КУЛЬТУРА СЦІСЛА

### Da Vinci па-беларуску

Да праекту «Тузін. Перазагрузка», у рамках якога іншамоўныя выканаўцы спяваюць свае песні па-беларуску, далучылася самая вядомая італьянскамоўная група Беларусі — Da Vinci. Для праекту музыкі абралі песню L’amore non esiste. Для іх гэта першы досвед працы з беларускім тэкстам, хоць адзін з аўтараў кампазіцыі, Леанід Шырын, прайшоў сапраўдную школу беларускага рок-ролу: ён працаваў у складзе гурту «Новае неба», а ў 1992 г. нават даў адзін канцэрт у якасці гітарыста з «Мрояй». Гэта потым ён ужо выступаў у складзе гурту Ірыны Дарафеевай і пісаў песні для Аляксандра Буйнова.

Перакладаць тэкст узяўся паэт Алесь Камоцкі, які раней пераклаў на беларускую народныя песні Італіі (для праекту «Бывайце здаровы! Bella Ciao») і Японіі (для альбому З.Вайцюшкевіча «Месяц і сонца»).



### Беларусь падае ў UNESCO цэлы спіс

На суд экспертаў Цэнтру сусветнай спадчыны UNESCO рыхтуюцца дасье «Фартыфікацыйныя пабудовы Брэсцкай крэпасці», «Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся», «Культавыя пабудовы абарончага тыпу (Сынковічы, Мураванка, Камаі)», а таксама па палацава-паркавым ансамблі ў Гомелі. Сумесна з польскім бокам падрыхтаванае дасье «Аўгустоўскі канал — твор чалавека і прыроды». Апроч таго, падрыхтаванае дасье «Матэрыяльнае ўвасабленне духоўнай спадчыны Еўфрасінні Полацкай», у адпаведнасці з якой прапануецца ўзяць пад абарону UNESCO Полацкую Спаса-Праабражэнскую царкву, Сафію і гістарычныя тэрыторыі, звязаныя з імем Еўфрасінні Полацкай.



У спіс UNESCO з Беларусі ўжо ўнесены Белавежская пушча (1992 г.), Мірскі замак (2000 г.), Геадэзічная дуга Струвэ (2005 г.), палац у Нясвіжы (2006 г.).

### Вольскі вядзе гумарыстычную праграму

21 красавіка прайшла прэм’ера новага праекту Лявона Вольскага, які завецца «Радыё Гамон». Перадача пад такой назвай ідзе на «Еўрапейскім радыё для Беларусі». Слухачы праз інтэрнэт-старонку будуць агучваць цікавыя для іх пытанні і тэмы, а Вольскі — адказваць. Таксама кожны раз будзе разгляд нейкай гарачай навіны і прэм’ера песні.

**Паводле music.fromby.net, budzma.org, БЕЛТА**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

# Мовы свету: ці ведаеце вы, што...

1) З агульнай колькасці жывых моваў, а іх прыблізна 2,5 тысячы, малой драбніцай не палова прыпадае ўсяго толькі на 8 (!) краінаў: Інданезію, Мексіку, Бразілію, Камерун, Індыю, Кітай, ЗША і Расію. У Індыі моваў налічваецца аж 845.

2) На караімскай мове сёння размаўляюць 535 чалавек.

3) 11 моваў маюць больш за 100 мільёнаў носьбітаў:

кітайская (больш за 1 млрд),
іспанская (блізу 400 млн),
англійская (400 млн),
хіндзі (245 млн),
расійская (200 млн),
бенгальская (200 млн),
арабская (175 млн),
інданезійская (150 млн),
партугальская (150 млн),
японская (каля 125 млн),
французская (112 млн).

4) У невялічкім Дагестане бытуе блізу 30 моваў.

5) Кіргізская мова мае пісьмо адно з 1927 году.

У выдавецтве Магілёўскага ўніверсітэту выйшаў цікавы і карысны даведнік, дзе пададзеныя звесткі пра мовы свету (каля 400 адзінак). Змяшчаецца інфармацыя аб прыблізнай колькасці моўнікаў, асаблівасцях граматыкі, лексікі, а таксама пра час з’яўлення пісьмовасці і сацыяльным статусе кожнай.

**Лявон К**

**Мовы свету: энцыклапедычны даведнік.** Укл. В.І. Рагаўцоў. — Магілёў: УА МДУ імя Куляшова, 2008. — 290 с.

# Дуда ў «Дудутках»

**Знаўцы старажытнага інструменту і аматары традыцыйнага фолку збяруцца сёлета на штогадовым міжнародным «Дударскім фэсце».**

Адкрыццё фестывалю адбудзецца ў сталічным клубе «Рэактар» 24 красавіка, а заключны канцэрт пройдзе 28 красавіка ды ўпершыню пад адкрытым небам.

Прадзюсар фестывалю Зміцер Сасноўскі кажа, што з'явіўся гурт Litvintroll, які прынцыпова выкарыстоўвае беларускія народныя дуды і спалучае іх з рокам.

«На канцэрце фэсту ім будзе аддадзеная цэлая гадзіна, каб гурт меў магчымасць пазнаёміць слухачоў са сваім новым альбомам».

Другое адрозненне фестывалю ў тым, што ў праграме з'явіўся папулярны і нават папсовы гурт, як сцвярджаюць самі музыкі. Гурт «ESPRIT» разам з дударом Алесем Чумаковым выканае тры кампазіцыі, дзве з іх — з шатландскай дудой, адну — з беларускай (яны розняцца канструкцыяй, тэхналогіяй вырабу, строем і рэпертуарам).

Кожны год на фестываль прыязджае новы замежны калектыў. Сёлета завітае гурт «Kapela ziele» з Познані, а ў заключны дзень разам з гуртом «Келіх кола» зайграе джэм-сэйшн музыка Рунэ з дацкага сярэднявечнага гурту «GNY».

Асноўнай разынкай для аматараў сярэднявечча і беларускай традыцыі будзе апошні дзень, 28 красавіка. Упершыню ў гісторыі «Дударскага фэсту» адбудзецца канцэрт на адкрытай пляцоўцы. Пройдзе ён з 13.00 да 19.00 у фальварку «Дудуткі».

«Мы запрасілі рамеснікаў, будзе працаваць нацыянальная кухня, можна будзе пакаштаваць нацыянальныя напоі. Турыстычныя фірмы абяцалі прывезці на фестываль турыстаў», — распавядаюць арганізатары.

На думку Змітра Сасноўскага, канцэрт пад адкрытым небам — унікальная магчымасць паслухаць, як гучаць і як сябе паводзяць беларускія дуды на адкрытым паветры. «Напрыклад, — кажа музыка, — на дударскіх фэстах у Англіі і Шатландыі ёсць нават выпрабаванне: тры гадзіны дудар мусіць граць на адкрытым паветры, каб паказаць, што яго дуда — прафесійная».

Трэці год запар у межах «Дударскага фэсту» адбудзецца навуковая канферэнцыя. Па традыцыі месцам сустрэчы дудароў стане хутар старэйшага майстра Алеся Лася, што на Валожыншчыне.

Сярод удзельнікаў сёлетняга «Дударскага фэсту»: «Стары Ольса», «Testamentum terrae», «Расалія», «Ceilidh Ceol», «ESPRIT», «Келіх кола», Тодар Кашкурэвіч, Дзяніс Сухі і гурт «Дзівасіл», «Kapela ziele» (Польшча), гурт «Гістрыён».

**Алена Скорабагатава**




## КАНЦЭРТЫ


GENERATION.BY

### J:морс

**25 красавіка ў к/з «Мінск»** выступае гурт J:морс з новым альбомам «Аквамарын». **Пачатак а 19-й.**

### Меладрама

У рамках Міжнароднага фестывалю класічнай музыкі «Меладрама» **ў Белдзяржфілармоніі (пр.Незалежнасці, 50) 27 і 30 красавіка** пройдуць канцэрты з удзелам французскіх музыкаў **Жэрома Дзюкро** (фартэпіяна) і **Жэрома Перно** (віяланчэль). **Пачатак у 16.00.**

### Дударскі фэст — 2009

**24 красавіка ў «Рэактары» (вул.В.Харужай, 29)** — Дударскі фэст. Выступаюць: **«Стары Ольса», Testamentum Terrae, «Расалія», Ceilidh Ceol, «Келіх кола», Тодар Кашкурэвіч, Дзяніс Сухі** і гурт **«Дзівасіл», Kapela ziele** (Польшча), **Litvintroll. Пачатак а 18-й.**

### Турнэ Змітра Вайцюшкевіча

**23 красавіка** Зміцер Вайцюшкевіч выступіць **у Івянцы**. Канцэрт будзе ладзіцца **ў доме культуры і пачнецца а 18-й. 24 красавіка** адбудзецца сольны выступ Змітра Вайцюшкевіча **ў Мінскім Інстытуце культуры. Пачатак а 18-й. 25 красавіка** спявак наведае **Іўе**. Канцэрт адбудзецца **ў мясцовым Доме культуры. Пачатак а 16-й. У гэты ж дзень** адбудзецца канцэрт **у Навагрудку, у Зале Кастрычніка**. Пачнецца імпрэза **ў 19.30**. І **26 красавіка** музыка дасць канцэрт **на Малой сцэне Купалаўскага тэатру. Пачатак а 19-й.**

### Ulis у Полацку

**25 красавіка ў вялікай зале полацкага гарадскога Палацу культуры** — канцэрт гурту Ulis.

### «РСП» і «Кальмары»

**30 красавіка** гурты «Разбітае сэрца пацана» (Мінск) і «Кальмары» (Бяроза) іграюць канцэрт **у «Рэактары». Пачатак у 19.00.** Квіткі ад 15 да 30 тыс. рублёў. Даведкі праз т.: (29) 649–08–88.

## ІМПРЭЗЫ

### Эксперыментальны тэатр з Любліна

**З 12 да 14 мая на сцэне Тэатру-студыі імя Еўсцігнея Міровіча (Акадэмія мастацтваў)** адбудзецца прэзентацыя еўрапейскага эксперыментальнага тэатру з Любліна (Польшча) «Пластычная сцэна кул». У рамках імпрэзы **12 мая ў Музеі сучаснага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47)** адчыніцца выстава плакатаў Лешака Мандзіка. **Пачатак а 17-й.** Уваход вольны. **У той самы дзень на сцэне Тэатру-студыі (пр.Незалежнасці, 81)** — прэзентацыя спектаклю «Вільготнасць». Уваход вольны. **Пачатак а 19-й і ў 20.30. 13 мая ў Тэатры-студыі а 17-й** — творчая сустрэча з Лешакам Мондзікам (уваход вольны). **А 19-й** — прэзентацыя спектаклю «Баразна». (**Уваход з вул.Сурганава ў дворык Акадэміі мастацтваў,** дзе адбудзецца спектакль).

### Беланогая, Мартыненка і Мяльгуй у Гродне

**29 красавіка** Фан-клуб беларускага року «Будзьма свабоднымі» запрашае ў Гродна на сустрэчу з аўтарамі кнігі «222 альбомы беларускага року» Вітаўтам Мартыненкам і Анатолем Мельгуём. У імпрэзе бярэ ўдзел і папулярная бард-рок спявачка Таццяна Беланогая, якая прадставіць альбом «Дзвюхкроп'е» і новыя песні. Сустрэча пройдзе па адрасу: **Гродна, вул.Будзённага, 48а-44.** Уваход вольны! **Пачатак у 18.30.** Даведкі праз т.: (029) 649–08–88.

### Літаратурная сустрэча ў Віцебску

Сустрэча-абмеркаванне на тэму «Рэгіянальная літаратура ў справе паўставання рэгіянальнай культурніцкай прасторы» з удзелам пісьменнікаў Алеся Аркуша, Франца Сіўко, Арцёма Арашонка і паэта Віталя Рыжкова адбудзецца **23 красавіка ў «Еўрапейскім клубе» (вул. 1-я Сеннеская, д. 5, Віцебск)**. У межах сустрэчы адбудзецца прэзентацыя новай кнігі Алеся Аркуша «Брызгалаўка». **Пачатак у 18.30.**

## ВЫСТАВЫ

### Мікалай Аўчыннікаў

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20) да 12 мая** працуе выстава акварэльных працаў Мікалая Аўчыннікава «Далёкае і блізкае».

### Расія вачыма беларуса

**У Мастацкім музеі да 11 мая** працуе выстава Леаніда Дударэнкі «Расія вачыма беларуса»

### Класічны танец

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва да 17 мая** працуе фотавыстава «Класічны танец». Аўтары — Віталь Брусінскі, Наталля Коўш.

### Мроі-віджэжы

**У галерэі «Мастацтва» (пр.Незалежнасці, 12) да 5 мая** працуе выстава фатаграфікі Рымантаса Дыхавічуса «Мроі-віджэжы».

### «Рыбны дзень» у Палацы мастацтваў

**25 красавіка а 18-й гадзіне ў Палацы мастацтваў (вул.Казлова, 3)** пройдзе акцыя «Рыбны дзень», прэзентацыя нумара часопісу «Тэксты», прысвечанага марской тэматыцы і краме «Рыба». Выступяць Зміцер Вішнёў, Лёлік Ушкін, Вікторыя Біран, Ярыла Пшанічны, Анка Упала, Вера Бурлак, Віктар Жыбуль, Вольга Гапеева, Уладзіслаў Бубен... Уваход вольны.

### Марцовыя каты

**У галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) да 2 мая** працуе выстава «Марцовыя каты». Уваход вольны.

### Кароткія гісторыі Пітара Хіксана

**У Мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) да 15 мая** працуе выстава жывапісу Пітара Хіксана «Кароткія гісторыі».

## Галерэя «Падземка» зачыняецца — крама «Падземка» застаецца

Папулярная мастацкая галерэя «Падземка», якая месцілася ў аднайменнай краме на праспекце Незалежнасці, спыняе існаванне. Сама крама «Падземка» застаецца.

«У працэсе рэарганізацыі прыватнай юрыдычнай асобы, на базе якой працавала галерэя «Падземка», скасаванае структурнае падраздзяленне, дырэктаркай якога была я,— кажа былая дырэктарка галерэі Валянціна Кісялёва. — Усё здарылася за адзін дзень: гаспадар крамы і памяшкання заявіў, што фармат галерэі яму нецікавы і ён яе зачыняе».

«Прычына закрыцця галерэі — нерэнтабельнасць, — кажа гаспадар крамы і памяшкання Павал Рысакоў. — Разам з тым, сама крама не зачыняецца — яна так і будзе называцца «Падземкай».

Галерэя ў краме «Падземка» была папулярнай пляцоўкай для выстаў і прэзентацый. Не так даўно ў ёй праходзіла аўтарская выстава Адама Глобуса. У самой краме прадаюцца сувеніры, дыскі, індыйскія тавары. Працуе кнігарня з беларускімі кнігамі.

Галерэя «Падземка» будзе існаваць у інтэрнэт-фармаце, а запланаваныя культурныя праекты — праводзіцца на іншых пляцоўках Мінску.

**ЛК**

### Хадановіч у «Падземцы»

**23 красавіка ад 18.00 да 19.00 у краме «Падземка» прадаваць свае і чужыя кнігі, адказваць на пытанні, даваць аўтографы і парады будзе паэт і перакладчык Андрэй Хадановіч.**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Навагоднія прыгоды ў ліпені

Беларусь, 2009, каляровы.
**Рэжысёры:** Алена Турава, Іван Паўлаў
**Ролі выконваюць:** Марыя Забара, Васіль Кубекін, Ігар Бочкін, Данііл Співакоўскі, Павал Адамчыкаў, Арсені Сячко, Дзмітры Пустыльнік, Сяргей Журавель
**Жанр:** Казачныя музычныя прыгоды паводле сцэнару Алены Туравай
**Рэжысура:** 4,5 (з 10)
**Сцэнар:** 3
**Акторская гульня:** 5
**Кампутарныя і адмысловыя эфекты, дызайн, анімацыя:** 7,5

Дашка Катастрофа і яе сябар Саша з дапамогаю клюшкі і зламанай лядоўні трапляюць у віртуальны свет, дзе пануе злосны кампутарны Гала-Вірус. Уладалюбны Вірус марыць знішчыць усе святы і асабліва Новы год — разам са Снягуркаю і Дзедам Марозам. Але Вірус недаацаніў сучасных дзетак…

Карціна, знятая Аленай Туравай (дачкой рэжысёра Віктара Турава) ды Іванам Паўлавым, — гэта кампутарная галаваломка, што спрабуе вярнуць залатыя часы беларускага дзіцячага кіно.

Самае лепшае ў фільме — графіка, анімацыя і дызайн — нечуваныя для сучаснай Нацыянальнай кінастудыі (а калі б стужка выйшла ў 1990-я гады, гэта ўвогуле сталася б пераваротам).

Фіялетавыя грыбы і вогненная жанчына, месяцовыя ландшафты, дзе вусцішныя расліны граюць у футбол гарматным ядром (маленькая дзяўчынка ў кінатэатры прыціскалася да матулі: «Мама, мне страшна!»). Чорныя вежы і гральны аўтамат-робат; твар чалавека-снегавіка. Нарэшце, самае смачнае — сольныя нумары Гала-Віруса (Данііл Співакоўскі). Ён то пірат, то генерал, то чарнакніжнік (за кожным — свая кінатрадыцыя). Камбінаваныя кадры, марш-парад злых сілаў, моцная і квітнеючая вірусаландыя.

Нягоднікі ў карціне — выразныя: Спам, навязлівы рэкламны агент, які марыць пра цыркавое шоў, Глюк — тармазнуты наркуша-хіпі, платаядная гратэскная бабка (Сяргей Журавель).



Затое дабро, як і ў фільме «На спіне ў чорнага ката», — сцішанае і млявае. Дзеткі-героі, у лепшым выпадку, — персанажы кампутарнага квесту, якія змагаюцца за натужліва-ананімнае свята.

Сцэнар — самае слабое ў карціне. Стужка — набор кампутарных атракцыёнаў, раздзеленых пазяханнямі гледача.

Але для «Беларусьфільму» — гэта ўжо нешта жывое і нестандартнае.

**Андрэй Расінскі**

# «Белсат»: тэлепраграма на 20—26 красавіка
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 27 красавіка, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял: 25 серыя
**19.05** «Без рэтушы»: «Белы ветразь над Прыпяцццю», дак. фільм, рэж. Уладзімір Колас, 2008 г., Беларусь
**20.00** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20.35** «Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў», 6 серыя: «Фінансавы крызіс»
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21.40** «Метад», маст. фільм, рэж. Марсэлё Пінейра, 2005 г., Іспанія—Францыя.
**23.35** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 14 серыя
**00.20** Аб'ектыў (навіны)

### 28 красавіка, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 14 серыя
**19.00** «Тры таварышы», дак. фільм, рэж. Маша Новікава, 2006 г., Галандыя
**20.40** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.15** Маю права (прававая праграма)
**21.35** Форум (ток-шоу): Як выйсці з крызісу?
**22.20** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.50** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**23.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 15 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 29 красавіка, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 15 серыя
**18.55** «Гаспадар...», дак. фільм, рэж. Рымвід Блашчак, 2008 г., Польшча
**19.20** «Права быць свабодным» — канцэрт альтэрнатыўнай музыкі — Луцк-2007: ч. 2. выступ гурту «Індыга».
**19.45** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**20.00** «Радыяцыйнае дзяцінства», дак. фільм, рэж. Яраслаў Каменьскі, 1996 г., Польшча
*Фільм распавядае пра хворых дзяцей, якія нарадзіліся ў Беларусі ды Украіне перад аварыяй на Чарнобыльскай АЭС або адразу пасля яе. Аўтар вандруе з камерай па хатах, школах, лякарнях, адлюстроўваючы, як бедства адбілася на малечы. Стужка асвятляе і тое, як міжнародная супольнасць дапамагае хворым дзецям.*
**20.30** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.15** Рэпарцёр
**21.45** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Дзяржавы»
**21.55** «Мільёны», маст. фільм, рэж. Дэні Бойл, 2004 г., Вялікая Брытанія.
*Вялікая Брытанія рыхтуецца да пераходу з фунтаў на еўра. Група злачынцаў вырашае абрабаваць цягнік, які перавозіць брытанскія грошы да месца знішчэння. Падчас рабунку адну з грашовых торбаў зламыснікі згубілі перад «домам» з кардонных скрыняў малога Дэйміена, якому ўвесь час мрояцца святыя... Аўтары фільму звяртаюць увагу на праблемы маралі і чалавечнасці.*
**23.30** З архіву «Jazz Jamboree»: «Sun Ra Arkestra», ч. 2
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 30 красавіка, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Мільёны», маст. фільм, рэж. Дэні Бойл, 2004 г., Вялікая Брытанія.
**19.45** «Невядомая Беларусь»: «Дзень «Ч». Версія», дак. фільм, рэж. Леанід Міндлін, 2009 г., Беларусь, ч. 2
**20.15** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.30** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.35** Інтэрнаўты выбіраюць
**22.30** Беларусы ў Польшчы
**22.45** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 4 серыя
**23.35** Кружэлка (сусветная музыка)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 1 траўня, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 4 серыя
**19.00** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.30** Маю права (прававая праграма)
**19.45** «Дзеці вялікага возера», дак. фільм, рэж. Насця Тарасава і Ірына Шаталава, 2008 г., Расія
*Расія, БАМ, возера Байкал. Гэты дакументальны фільм сведчыць пра тое, што адбываецца цяпер у малой вёсцы ля самага вялікага возера свету. У савецкія часы сюды прыязджала шмат маладых людзей, якія жадалі ўзяць удзел у вялікай будоўлі — у пракладанні Байкала-Амурскай магістралі. Аўтары фільму распавядаюць пра людзей, якія жывуць уздоўж чыгункі, пра БАМаўцаў.*
**20.15** Рэпарцёр
**20.40** Кінастужка (агляд кінарынку)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»: Уладзімір Валетка
**21.35** «Вулічныя гульні», маст. фільм, рэж. Кшыштаф Краўзэ, 1996 г., Польшча
*Тэлерэпарцёр Янэк Роса і ягоны аператар Вітэк амаль праз 20 гадоў пошукаў трапляюць на след, які ўказвае на абставіны смерці кракаўскага студэнта Станіслава Пыяса, якога ў 1977 г. забіў УБ (польскі КДБ). Янэк робіцца небяспечным для былых УБоўцаў, якія вырашаюць яго зліквідаваць.*
**23.15** «Апошні сезон», серыял, рэж. Гінэк Бочан, 2006 г., Чэхія: 1 серыя
*Зорка НХЛ Ян Крол вяртаецца на радзіму, закончыўшы кар'еру за акіянам. Ён больш не хоча гуляць і вырашае прысвяціць сябе жонцы і сыну, на якіх яму доўга не ставала часу. Ён селіцца ў невялікімі горадзе Лібэрэц, але адысці ад справаў не так лёгка...*
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 2 траўня, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**18.40** «Мост кветак», дак. фільм, рэж. Томас Чулей, 2008 г., Румынія
*У малдаўскай вёсцы бацька сам гадуе траіх дзяцей. Жонка — на працы ў Італіі, адкуль яна час ад часу звоніць і пасылае грошы. Матчына дапамога дае магчымасць сям'і выжыць у ці не найбяднейшай краіне Еўропы.*
**20.10** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**20.35** Кухня (музычная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Валянцін Тарас», дак. фільм, 2007 г., Беларусь
*Валянцін Тарас быў сапраўднай энцыклапедыяй жыцця Мінску і Беларусі. Вядомага пісьменніка, паэта і перакладчыка засмучалі праявы сённяшняй рэчаіснасці: катастрафічная сітуацыя з беларускай моваю, стаўленне ўладаў да творцаў. Як пісьменнік і чалавек, які чуйна прыслухоўваецца да зменаў у чалавечай супольнасці, ён здольны быў неардынарна ацэньваць стан сённяшняй літаратуры, культуры і ўсяго беларускага грамадства.*
**21.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.05** Суботні сеанс: «Рыцары неба», маст. фільм, рэж. Жэрар Пірэс, 2005 г., Францыя.
*Падчас авіясалону тэрарысты выкрадаюць суперсучасны знішчальнік. Лётчыкаў Маршэлі і Валюа адпраўляюць патруляваць Паўночнае мора, над якім якраз з экранаў радараў знік скрадзены самалёт... І гэта толькі прэлюдыя да сапраўднай бітвы, якая здарыцца ў небе над Елісейскімі палямі ў Дзень узяцця Бастыліі...*
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 3 траўня, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.15** «Ранча», серыял: 26 серыя




**19.10** Форум (ток-шоу): Іншая Беларусь
*Мы запрашаем вас у іншую Беларусь, пра якую, напэўна, ведае шмат хто, хоць пра яе не гаворыць Беларускае тэлебачанне, не піша «Советская Белоруссия». А калі і піша, то негатыўна. Гэта Беларусь тых людзей, якія маюць свой уласны гонар і працуюць для таго, каб у нашай краіне паўстала рэальнае грамадства. Без яго дэмакратычная краіна не можа існаваць. Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы стварылі антыкрызісную праграму. На сакавіцкай нарадзе Грамадска-кансультацыйнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта праграму прэзентаваў адзін з яе аўтараў — былы кіраўнік Нацыянальнага банку праф. Станіслаў Багданкевіч. Аднак яшчэ да гэтай прэзентацыі ўлады скептычна ставіліся да любых ідэяў апазіцыі, хоць урад не мае сваёй антыкрызіснай праграмы.*
**19.55** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**20.25** «Святаслаў Фёдараў — жыццё пасля смерці», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2006 г., Беларусь, ч. 1: «Быстры»
*Этап «перабудовы» ў СССР даў такім постацям, як выдатны афтальмолаг Святаслаў Фёдараў, новыя магчымасці працаваць на карысць грамадству.*
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Рагвалод і Рагнеда»
*Найстаражытнейшы горад Беларусі — Полацк. Полацкае княства сталася пачаткам беларускай дзяржаўнасці. Першым вядомым нам полацкім князем быў Рагвалод.*
**21.25** Фільматэка майстроў: «Разбіраючы Гары», маст. фільм, рэж. Вудзі Ален, 1997 г., ЗША.
*Вядомы пісьменнік Гары Блок (Вудзі Ален) перажывае жыццёвы і творчы крызіс. Якраз у гэты час яго вырашаюць ушанаваць ва ўніверсітэце, адкуль калісьці выгналі. Ён туды прыязджае з прастытуткаю, трупам і сынам, якога скраў у адной са сваіх былых жонак...*
**23.00** «Рок карона—2008», ч. 1
**23.55** «Бульбаны», мультсерыял
**00.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)

# Швейцарская рэпетыцыя перад Алімпіядай



А гэта Кулі — сімвал сёлетняга чэмпіянату.

**Ад 24 красавіка да 10 траўня ў Швейцарыі пройдзе 73-і чэмпіянат свету па хакеі з шайбай. Каманда нашай краіны возьме ўдзел у матчах элітнага дывізіёну.**

У групу «А» з беларусамі, якія ўдзельнічаюць у чэмпіянаце дзесяты раз у сваёй гісторыі, трапілі вынаходнікі хакею з Канады, Славакія, а таксама дэбютанты першынства з Венгрыі. Групавыя гульні нашы хлопцы правядуць у Клатэне, што побач з Цюрыхам. Расклад сустрэчаў наступны:

24 красавіка (пятніца). Беларусь — Канада.

26 красавіка (нядзеля). Славакія — Беларусь.

28 красавіка (аўторак). Венгрыя — Беларусь.

Пачатак усіх сустрэчаў a 17.15. Для тых, хто не трапіць у Швейцарыю, будуць прамыя трансляцыі на тэлеканале «Лад».

Для выхаду з групы дастаткова не заняць апошняе месца. У выпадку станоўчага для нас працягу першынства мы трапляем на трыо шчаслівчыкаў з групы «D», дзе сабраліся Фінляндыя, Чэхія, Нарвегія і Данія.

Сёлета зборную зноў узначаліў харызматычны канадскі спецыяліст Глен Хэнлан, які тры гады таму ўжо кіраваў нацыянальнай камандай. Менавіта з ягоным імем звязаны найбольшы поспех беларусаў на сусветных першынствах. У 2006 г. у Рызе нашы занялі шостае месца. Цяпер задача — узяць пазіцыю як мінімум не ніжэйшую.

Хэнлан здолеў сабраць амаль усіх наймацнейшых айчынных хакеістаў, апроч зорных братоў Касціцыных, якія ўсё яшчэ змагаюцца за акіянам за Кубак Стэнлі.

Швейцарскі чэмпіянат свету стане апошній рэпетыцыяй перад Алімпіядай-2010 у Ванкуверы. Зававаць медалі сусветнага першынства таксама прэстыжна, але Алімпійскія гульні ўсё ж каціруюцца нашмат вышэй.

Таксама ў Швейцарыі будзе вызначаны гаспадар сусветнага першынства па хакеі ў 2014 г. Беларусь з Венгрыяй значыцца сярод галоўных фаварытаў, ва ўкраінцаў і латышоў шанцы нашмат меншыя. Прэзентацыю Беларусі ў алімпійскую краіну паедзе рабіць невыязны экс-міністр Навумаў.

Ну а асноўнымі прэтэндэнтамі на золата сёлетняга чэмпіянату звыкла з'яўляюцца расіяне, шведы, канадцы, чэхі і фіны. Напэўна, не памылімся, калі скажам, што менавіта некаму з іх усміхнецца ўдача.

**Зміцер Панкавец**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Прыгоды бравага салдата Швейка ў часы Усходняга Партнёрства

Фельетон **Лёліка Ушкіна**.

— Запрасілі, значыць, дыктатара нашага, — сказала Швейку ягоная служанка пані Мюлевара.

— Якога дыктатара? – сказаў Швейк, масіруючы калені. — Я ведаю двух дыктатараў: Кіма і Татукіма. І ніводнага з іх мне зусім не шкада.

— Не, пане, апошняга дыктатара Еўропы. Таго, стабільнага. Запрасілі на пражскі саміт Еўрасаюзу.

— Ісус Марыя! — выгукнуў Швейк. — Вось дык так! І як гэта магло адбыцца?

— Міністр нашых справаў замежных яго запрасіў.

— Нічога сабе! Ды для такога запрашэння відавочна патрэбна нейкая асаблівая папера. Зразумела, запрашаць дыктатара — справа нялёгкая. Я б для такой справы набыў сабе аўтаручку: на першы погляд цацка, з дапамогай яе можна запрасіць хоць дваццаць дыктатараў, хоць стабільных, хоць якіх... Ну добра, калі што — я ў інтэрнэт-кавярні.

У інтэрнэт-кавярні сядзеў толькі адзін наведнік. Гэта быў агент таемнай паліцыі Брэтшнэйдар, які спрабаваў праверыць на крамолу бармена Паліўца.

— Ну і нарабілі нам спраў у Мінску!

— У якім такім Мінску? Мінску-Мазавецкім, ці што? Вядома, гэта ж эканамічна дэпрэсіўнае ваяводства Польшчы.

— У беларускім, пане. Наш МЗС уцягнуў у арбіту ўплыву аўтарытарны рэжым. Што вы пра гэта скажаце?

— Я ў такія справы не лезу. Тут Гаагай пахне.

Брэтшнэйдар расчаравана агледзеў пустую залу. Яго твар павесялеў, калі ў памяшканне зайшоў Швейк.

— Гэта ўсё літоўцы і палякі, новыя сябры Еўрасаюзу, нарабілі ў Мінску, — пастараўся накіраваць размову ў патрэбны кірунак Брэтшнэйдар.

— Памыляецеся, — адказаў Швейк, — гэта ўсё прэзервативы.

І Швейк выклаў свае погляды на сучасную еўрапейскую палітыку:

— Папа змагаецца супраць выкарыстання прэзерватываў і хацеў, каб Еўрасаюз дапамог. А калі гэты нумар не прайшоў, запрасіў у саюзнікі апошняга дыктатара Еўропы. Падумайце самі — ну навошта яшчэ ім сустракацца? А наш МЗС пабаяўся, што ствараецца партнёрства супраць прэзерватываў і яго таксама запрасіў. Цяпер будзе бойка.

Трэба чакаць спецыяльнай абразлівай энцыклікі Святога Рыму наконт Усходняга Партнёрства. А таксама цвярозай рэакцыі беларускага народу на ўсё гэта.

— А якой можа быць цвярозая рэакцыя беларускага народу? — ажывіўся агент.

— Ды любая. Працверазейце і папрасіце пачытаць вам услых «Советскую Белоруссию». Самі пабачыце, чаго вы нагаворыце.

Брэтшнэйдар падскочыў і папрасіў суразмоўцу на пару хвілін на вуліцу. Там Швейка чакаў невялікі сюрпрыз — сабутэльнік склаў на яго пратакол за брудную лаянку і спраўленне малой патрэбы ў публічным месцы. Цяпер увесь саміт Швейк мусіў парыцца на нарах у Панкрацы.

Потым Брэтшнэйдар вярнуўся у залу і сказаў Паліўцу, каб таксама збіраўся.

— За што?! Я такі асцярожны.

— А чаму на сцяне партрэт Вацлава Клаўса, а не Карла Шварцэнберга?..

Так уступіў у эру Усходняга Партнёрства бравы салдат Швейк. Калі далей падзеі разгарнуліся не так, як ён думаў, дык толькі таму, што Швейк на той момант проста не разумеў тонкасцяў палітыкі ЕС ва Усходняй Еўропе.

## ПАДСЛУХАНА

### Ні ў Бога, ні ў расліну

Пра хворага сваяка: «Яму б палын прымаць. Палын пры гэтай хваробе дапамагае... Але ж ён ні ў што не верыць: ні ў Бога, ні ў расліны».

### Харошанькі хлопчык Віця Грэбенштэйн

Мінск, плошча Якуба Коласа, малады чалавек кажа камусьці па мабільніку: «Шо, ты мяне не памятаеш? Ну, Віця Грэбенштэйн, чорненькі такі, харошанькі хлопчык...»

### Пераемнік, кажаце? Усё значна горай

Горад Фаніпаль, размаўляюць пенсіянеры на лавачцы: «Вось калі малому, ну, Колю споўніцца 18 гадоў, тады ўжо Лукашэнка пойдзе. Я ў газеце чытала, ён сам сказаў, што Коля — мой... гэты, як яго... прадшэственік».

### А куфар проста адчыняўся

Вёска Ачыжа, Чэрвеньскі р-н, Мінская вобл., лазня. У лазні прысутнічае ісцінна-рускі генерал, які грэбуе беларускай мовай, але наогул чалавек старога гарту, інтэлігентны. Ніколі не лаецца матам, выражаецца культурна. Генерал распавядае прысутным:

— Вы знаете, вчера на холодильнике мы обнаружили мышиный кал...

Далей ідуць доўгія спрэчкі з нагоды таго, як гэта магло здарыцца, выказваюцца меркаванні, выбудоўваюцца версіі. І тут мясцовы ляснік, алкаголік і мацяршчыннік, які слухаў напаўвуха ўсе гэтыя тэарэтызаванні, нечакана рэзюмуе:

— Залезла ды нас...ла!

**community.livejournal.com/overheard_by**

Наступны нумар газеты выйдзе 6 мая. Адведайце сваіх на Радуніцу.

## Радуніца


PHOTO.BYMEDIA.NET


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Паводле царкоўнай традыцыі перад Вялікаднем мітрапаліт у храме абмыў ногі япіскапам Беларускай праваслаўнай царквы.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Дарагога тату Вячаслава Аляксандравіча** з 60-годдзем віншуюць сыны Віктар і Альгерд. Дзякуй табе, тата, за тое, што гадаваў нас, і як гадаваў

**Віншую Залесачку-Прыгажуню** з Уваскрасеннем Хрыстовым! Аляксей

### ТАМАДА

**Шукаем** беларускамоўнага тамаду на 25 ліпеня. Т.: (029) 184-24-20

### ПАСЛУГІ

**Выканаю** любую працу з тэкстамі (набор, пераклад, карэктура, рэдактура). Т.: (029) 198-32-51

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Звяртацца загадзя. Т.: (029) 101-03-24, Юрась

### ІНІЦЫЯТЫВЫ

**Бясплатныя курсы** мовы, культуры, гісторыі, іншых прадметаў з настаўнікамі Беларускага Ліцэю — сябрамі Таварыства беларускай мовы. Для вучняў 7—9 (9') класаў. Арганізацыйны збор 22 красавіка 2009 г. а 18-й на сядзібе ТБМ (вул.Румянцава, 13, ст.метро «Плошча Перамогі»).

**Ды-джэі адраджэння** штопятніцу на пр.Машэрава, 8 (былая вул.Варвашэні, 8) — лідэрскія курсы ды-джэяў адраджэння. Пачатак у 18.00. Т.: (029) 765-36-92, (029) 263-50-57

### ДАВЕДНІК

**Падрыхтаваны** эксклюзіўны энцыклапедычны даведнік «Рэпрэсаваныя святары». Калі Вам вядома што пра пакутнікаў або ёсць магчымасць паўдзельнічаць у праекце, тэлефануйце: (029) 753-82-12, (029) 755-25-61, (017) 211-09-53. Леанід Маракоў

**Прыватныя абвесткі ў «НН»**
(не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Вілейка Віленскай губ.** 5 красавіка ў рэстаране мяшчане пілі, дый, відаць, перапіліся праз меру, пачалі сварыцца і аднаму некалькі разоў усадзілі ў бок нож. Стараюцца вілейскія мяшчане!

**«Наша Ніва». №16. 1909**

Наша Ніва
незалежная газета

заснаваная ў 1906, аднюўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5713. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 21.04.2009.
Замова № 2169.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9771819161008 09016